ЗЬВЯЗДА

Пралетары всіх краін, злучайцеся!

№ 184 (3292) Серада, 14-га жніўня 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63

ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII

Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

СТАКГОЛЬМ, 10. Орган дацкай кампартыі „Арбайтэр Блатэд“ апублікаваў прапанову ЎсеЦСПС да ўсіх рабочых паслаць дэлегацыю ў СССР, у склад якой павінны ўвайсьці прадстаўнікі ад транспартных рабочых, мэталістых, будаўнікоў і рабочых хэмікаў.

НАВІНЫ Б. С. С. Р.

МАГІЛЕЎ. (Наш. кар.) Камуна „Беларусь“, Лупалаўскага раёну. у адказ на напад кітайскіх імпэрыялістых, пастанавіла засеяць у карысьць індустрыялізацыі 1 з пал. дзесяцін зямлі. Выкліканы рад іншых камун. 19 жніўня камуна працуе ў карысьць індустрыялізацыі

ІНІЦЫЯТЫВА КАМУНІСТЫХ ДОБРУША

НІВОДНАГА ПАРТЫЙЦА, ЯКІ-Б НЯ ВЫПІСВАЎ „ЗЬВЯЗДУ“

У пэрыяд разгорнутага сацыялістычнага наступленьня, у пэрыяд сацыялістычнага спаборніцтва па выкананьні плянаў нашага будаўніцтва.—Добрускія камуністы правільна зразумелі вагромністую арганізуючую ролю партыйнага друку, яны выклікаюць калектывы фабрык і заводаў на спаборніцтвы па падпісцы на „Зьвязду“

ПАРТКАЛЕКТЫВЫ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ БССР—СЛОВА ЗА ВАМІ

ПАЧАТАК ВЯЛІКАЙ СПРАВЫ

Сёньня мы друкуем пастанову камуністых Добрушу аб выпісцы «Зьвязды» усімі членамі і кандыдатамі КП(б)Б гэтага раёну. Добрушане выклікаюць пасьледваць іх прыкладу ўсе парткалектывы буйных прадпрыемстваў Беларусі. Адначасова добрускія камуністыя бяруцца пашырыць «Зьвязду» і сярод беспартыйных рабочых сваёй фабрыкі «Гэрой Працы» і запрашаюць усю КП(б)Б практычна ўзяцца за справу распаўсюджаньня свайго цэнтральнага органу.

Камуністыя Добрушу гэтай сваёй пастановай і выклікам кладуць пачатак вялікай справе.

У складаных умовах рэканструкцыйнага пэрыяду, абвостранай клясавай барацьбы, эпохі пачатку культурнай рэвалюцыі, роля газэты як «калектыўнага арганізатара і агітатара» становіцца надзвычайна вялікай. Асабліва вялікая роля асноўнай партыйнай газэты ў наш час ва ўмовах нацыянальнай рэспублікі. Гэтую сваю ролю газэта здолее выканаць толькі ў тым выпадку, калі ёй акажа падтрыманьне ўся партыйная арганізацыя ўцалку.

Рэдакцыя «Зьвязды» добра разумее, што наша газэта мае вялікія недахопы, што яшчэ шмат чаго трэба зрабіць, каб «Зьвязда» сапраўды зрабілася патрэбнай, такой газэтай, без якой ніводзін член і кандыдат КП(б)Б, ніводзін беспартыйны актывісты ня мог бы абыйсьціся ў сваёй практычнай рабоце.

Але ніякая рэдакцыя ня здолее справіцца з гэтымі задачамі бяз шырокага падтрыманьня мас чытачоў, без актыўнай дапамогі усёй партыйнай арганізацыі. Падтрыманьне гэта павінна выяўляцца перш за ўсё ў тым, каб газэту выпісвалі, чыталі, пісалі ў яе, былі з ёй моцна зьвязаны, папулярызавалі яе ў масах.

Добрушане пайказваюць, як трэба пачынаць аказваць гэтае падтрыманьне. Добрушане справядліва паказваюць, што пытаньне аб пашырэньні «Зьвязды» ня раз узьнімалася ў нашай партыйнай арганізацыі, але далей рэзалюцый і цыркуляраў справа ня ішла. І добрушане першыя рэальна бяруцца за выкананьне раней ухваленых партыйных пастаноў аб тым, што не павінна быць: **«ніводнага партыйца, які-б ня выпісваў «Зьвязду». Ініцыятыва добрушан павінна быць падтрымана ўсімі арганізацыямі КП(б)Б.**

Рэдакцыя-ж з свайго боку зробіць усе намаганьні да таго, каб узмоцненай работай над зьместам і мовай газэты, над умацаваньнем і ўсё большым пашырэньні сувязі газэты з партыйнымі, рабочымі, бядняцкімі і батрацкімі масамі, зрабіць **«Зьвязду»** вострааточанай зброяй КП(б)Б у барацьбе за генэральную лінію партыі, за сацыялістычнае перабудаваньне нашай краіны.

Тав. Гамарнік вітае пачын добрушан

Вітаю выклік Добрускага парткалектыву аб падпісцы на газэту „ЗЬВЯЗДУ“. Жадаю ўсякага посьпеху ў гэтай важнай вялікай партыйнай справе. Сучасны тыраж „ЗЬВЯЗДЫ“ малы і не адпавядае тым вагромнейшым задачам, якія стаяць перад цэнтральным органам кампартыі Беларусі. Трэба больш увагі з боку ўсёй партыі да „ЗЬВЯЗДЫ“, больш сувязі з ёй, больш удзелу ў яе рабоце. Маё пажаданьне, каб добрускі пачын даў падваеньне тыражу газэты.

З кампрывітаньнем ГАМАРНІК.

13-VIII—29 г.

ВЫКЛІК

ПРЫНЯТЫ АДНАГАЛОСНА НА ДОБРУСКІМ РАЁННЫМ ПАРТЫЙНЫМ СХОДЗЕ

11-га жніўня 1929 году

У партыйных масах КП(б)Б, у масах рабочае клясы і ня беспартыйнага актыву **яшчэ да гэтай пары не ўсьвядомлена, як належыць, вялічэзная роля газэты «ЗЬВЯЗДА» ва ўсім сацыялістычным будаўніцтве на Беларусі.** Між тым, нельга ўявіць сабе правільна наладжаную бальшавіцкую работу ізалявана ад «Зьвязды», ізалявана ад нашага цэнтральнага кіраўнічага органу. Нельга ўявіць сабе правільнае правядзеньне ў жыцьцё нацыянальнай палітыкі без адпачасовага прасоўваньня ў масы цэнтральнай беларускай партыйнай газэты.

Пытаньне аб «Зьвязьдзе» ня раз узьнімалася ў партыйнай арганізацыі Беларусі. Аднак, у большасьці выпадкаў справа ня ішла далей рэзалюцый і цыркуляраў. Лёзунг **«Няма ніводнага партыйца, які-б ня выпісваў Зьвязду»** — застаўся нявыкананым.

Неабходна гэты лёзунг ажыцьцявіць у самы бліжэйшы час.

Роля «Зьвязды» асабліва ўзрасла ў сучасны момант, калі ў краіне разгортваецца культурная рэвалюцыя і сацыялістычная рэканструкцыя народнай гаспадаркі. Багацейшы вопыт эпохі вялікіх работ крышталізуецца ў нашай цэнтральнай партыйнай газэце, якая дае яму бальшавіцкую ацэнку і высоўвае новыя задачы перад партыйнай арганізацыяй і рабочай клясай Беларусі.

Добруская раённая партарганізацыя ўсяцалкам падпісваецца на «Зьвязду» на 6 месяцаў і болей і выклікае ўсе партыйныя калектывы буйных прадпрыемстваў БССР пасьледваць як прыкладу.

У прыватнасьці мы выклікаем парткалектывы **Шклоўскай папяровай фабрыкі «Спартак» і чашніцкай «Чырвонай Зоркі»** пасьледваць заразжа нашаму прыкладу. Але гэтага мала. **Мы бярэм на сябе задачу распачаць сыстэматычнае прасоўваньне «Зьвязды» ў беспартыйную рабочую масу фабрыкі «Гэрой Працы» і лічым, што ўся КП(б)Б павінна практычна ўзяцца за такую справу.**

Няхай падпіска на «Зьвязду» **набудзе форму своеасаблівага сацыялістычнага спаборніцтва.** Няхай не застанецца ніводнага кутка на Беларусі, дзе-б ня было «Зьвязды», ніводнага працоўнага, які-б ня чытаў «Зьвязды»!

Няхай жыве КП(б)Б!

Няхай жыве яе баявы орган — «ЗЬВЯЗДА»!

НАВІНЫ САВЕЦКАГА ДНЯ

АМЭРЫКАНЦЫ ЗЬДЗІЎЛЕНЫ ГРАНДЫЁЗНАСЬЦЮ САВЕЦКАГА БУДАЎНІЦТВА

МАСКВА, 12. У Маскву вярнулася амэрыканская гандлёва-прамысловая дэлегацыя, якая наведала буйнейшыя раёны СССР. Сярод членаў дэлегацыі група амэрыканскіх журналістых, якія азнаёміўшыся з вытворчасьцю, умовамі працы і быту ў СССР, выказалі сваё зьдзіўленьне грандыёзнасьцю рэканструкцыйнай праграмы СССР сваю глыбокую ўпэўненасьць у посьпехах пяцігодкі, сваё захапленьне «здаровай» мудрай і шляхэтнай палітыкай савецкай улады. Журналістыя таксама падкрэсьлівалі наступленьне эры савецка-амэрыканскага супрацоўніцтва. (ТАСС).

Інжынэры фордаўскіх заводаў у Ленінградзе

ЛЕНІНГРАД, 12. Сёньня ў Ленінград прыбыла дэлегацыя амэрыканскіх заводаў Форда, якая складаецца з інжынэраў і прадстаўнікоў адміністрацыі фордаўскіх заводаў. Амэрыканскія інжынэры знаёмяцца з ленінградзкай прамысловасьцю. Сёньня яны наведалі завод «Чырвоны Пуціловец», дзе знаёміліся з пастаноўкай і ходам работ у трактарным цэху.

На фронце індустрыялізацыі

Навукова-тэхнічны савет у Томску зацьвердзіў праект коксавей капальні ў Пракоп'еўскай капальні, прадукцыйнасьцю ў 2 мільёны тон вугалю ў год. Па магутнасьці гэта будзе першая капальня ў СССР. На капальні будуць ужывацца ўсе апошнія дасягненьні навукі і тэхнікі.

10 жніўня на мэталюргічным заводзе ім. Карла Маркса ў Дняпрапятроўску **закладзена новая мартэнаўская печ,** прадукцыйнасьцю ў 55 тон сталі ў суткі.

Распачата пабудова Салікамскага рачнога порту, разьмерам для 30 параходаў з 100 барж. Новы порт зьявіцца базай для перавозкі калійных соляй. Акрамя таго Салікамскі порт будзе служыць зімоваўным пунктам для ўсяго Верхня-Камскага флёту.

У Церскай акрузе, на плошчы ў 40.000 гэк. **арганізуецца мясны саўгас** са стадам да 100.000 галоў. Зараз у раёне саўгасу ідзе пабудова двароў для жывёлы, вадаёмаў і інш.

ПАДПІСКА НА ТРЭЦЮЮ ПАЗЫКУ Ў БАКУ

БАКУ, 12. Падпіска на трэцюю пазыку ў Баку дала ўжо 4.400.000 руб. Прамысловыя раёны далі звыш 2,500.000 руб. (ТАСС).

АПОШНІЯ МАСКОЎСКІЯ НАВІНЫ

(АД НАШАГА КАРЭСПАНДЭНТА)

АЎТАПРАБЕГ МАСКВА-МЕНСК-МАСКВА

У прэзыдыуме Аўтодора распрацоўваецца пытаньне аб наладжаньні ў канцы жніўня аўта-прабегу Масква—Менск—Масква. У прабегу павінны ўдзельнічаць легкавыя машыны і грузавікі «Форд», «Шэвроле», «Бьюік» і інш.

Новы рэдактар „Комсомольской Правды“

ЦК УсеКП(б) зацьвердзіў новым рэдактарам «Комсомольской Правды» тав. Вартаняна, а яго першым намесьнікам тав. Файнбэрга.

Адказ працоўных Імпэрыялістым

Хваля пратэстаў працоўных мас БССР супроць нападу кітайскіх мілітарыстых ня сьціхае. Кожны дзень у рэдакцыю «Зьвязды» паступаюць дзесяткі рэзалюцый і пастаноў сходаў рабочых, працоўнага сялянства, саматужнікаў і чырвонаармейцаў.

Працоўныя БССР адказваюць на правакацыю канкрэтнымі мерамі па ўмацненьні індустрыялізацыі краіны і абароназдольнасьці СССР.

Сяляне вёскі Беларуч, Астрашыцка-Гарадзецкага раёну ў адказ імпэрыялістым пастанавілі:

— Здаць датэрмінова с.-г. падатак.

— Падпісацца на 3-ю пазыку індустрыялізацыі.

— Унесьці ў фонд індустрыялізацыі па 8 кілё хлеба.

— Выканаць поўнасьцю плян асеньняе сяўбы.

Усім уступіць у ячэйку Асоавіяхіму. **Рабочыя будаўніні,** што працуюць на ст. Талачын, унесьці аднадзённы заработак у разьмеры 56 руб. на пабудову самалёту «Будаўнік» і выклікалі ўсіх рабочых-будаўнікоў БССР.

Служачыя **1-ай пажарнай дружыны** г. Менску адлічылі 1 проц. зарплаты на пабудову самалёту «Чырвоны пажарнік» і выклікалі ўсе пажарныя каманды БССР.

Жонкі рабочых фабрыкі «Чырвоны Кастрычнік» адпрацавалі адзін дзень на карысьць пабудовы танка.

Камсамольцы **лешнянскай ячэйкі,** Капыльскага раёну пастанавілі здаць у фонд індустрыялізацыі па адным снопе з дзесяціны.

Члены камуны «Серп і Молат» пастанавілі васеяць адну дзесяціну азімага кліну ў фонд індустрыялізацыі. Камуна «Беларусь» засеяе дзьве дзесяціны і здае датэрмінова лішкі хлеба.

Камуна «Чырвоная Зорка» пастанавіла датэрмінова здаць с.-г. падатак. Працаўнікі Лупалаўскага РВК пастанавілі на працягу 5 год адлічваць у фонд індустрыялізацыі 1 проц. зарплаты.

Такіх пастаноў можна налічыць дзесяткамі. Яны выразна гавораць аб гатоўнасьці працоўных усімі мерамі падтрымаць савецкую краіну. Адкажам на напад імпэрыялістых паскарэньнем тэмпу індустрыялізацыі. У патрэбны момант зьмепім варштаты і плугі на вінтоўкі,—такі асноўны вымест заяў працоўных мас Савецкай Беларусі.

ГРАНДЫЁЗНАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ ПІЯНЭРАЎ У ХАРКАВЕ

ХАРКАЎ, 12. У гонар усеўкраінскага зьезду піянэраў у Харкаве адбылася грандыёзная дэманстрацыя піянэраў. У дэманстрацыі ўдзельнічала каля 80 тысяч чалавек. Дэманстрацыя прайшла пад знакам актыўнага ўдзелу піянэраў у ажыцьцяўленьні задач пяцігодкі. (ТАСС).

САВЕЦКІ ЦУКАР — НА ЭГІПЭЦКІМ РЫНКУ

КАНАТОП, 13. Карнілаўскі цукравы завод адправіў партыю цукру-рафінаду ў Эгіпэт. Упаўнаважаны Цукратрэсту на Блізкім Усходзе прыслаў заводакіраўніцтву тэлеграму, у якой гаворыцца, што савецкі цукар пасьпяхова рэалізуецца на эгіпэцкім рынку. (ТАСС).

Фабрыка „Гэрой Працы“ пушчана ў ход

11 жніўня была скончана пабудова перамычкі, якая забясьпечвала вадой пара-сілавую гаспадарку фабрыкі «Гэрой Працы» і давала магчымасьць пусьціць фабрыку ў ход.

Але раптам выявілася, што праз перамычку пачала прасочвацца вада, якая пагражала паралізаваць усю 4-х дзённую напружаную працу.

Прышлося кінуць новыя сілы на зямляныя работы, на канчатковую ўстаноўку перамычкі і пусьціць ваду з шлюзаў.

Учора а 2 гадз. дня работы былі скончаны: Фабрыка «Гэрой Працы» аднавіла работу.

ВСНГ—аб аварыі на Добрушы

Прэзыдыум ВСНГ 12-га жніўня заслухаў даклад аб аварыі на Добрускай папяровай фабрыцы. Прэзыдыум пастанавіў узнагарадзіць асобных рабочых і адміністрацыйна - тэхнічных працаўнікоў, якія праявілі асаблівую энэргію і актыўнасьць у ліквідацыі аварыі.

Вылучана спэцыяльная камісія з удзелам маскоўскага інжынэра для тэрміновага выяўленьня прычын аварыі і выпрацоўкі мер для далейшай бесперабойнай працы фабрыкі.

НА К.-УСХ. ЧЫГУНЦЫ

Масавыя арыштыі грабяжы савецкіх грамадзян

Белагвардзейцы рыхтуюцца да нападу на СССР

Поўны развал на чыгунцы

Звыш 3-х тысяч савецкіх служачых спынілі работу на чыгунцы

ТОКІЁ, 12. Па вестках агэнцтва «Дэмпо-Цусін» каля 200 савецкіх грамадзян, якія прыбылі 11 жніўня на станцыю Манчжурыя, **былі аграблены кітайскай паліцыяй.** З прычыны адсутнасьці цягнікоў яны ня могуць выехаць у СССР. «Токіё-Асахі» паведамляе са станцыі Пагранічная, што 60 савецкіх служачых Кітайска-Ўсходняй чыгункі, якія адмовіліся ад службы, арыштаваны паліцыяй. Паводле іншых вестак, учора на 9-ае жніўня ў Харбіне арыштавана 110 савецкіх грамадзян, у ліку якіх 60 камсамольцаў.

***

ТОКІЁ, 10. З Харбіну паведамляюць, што паліцыя акружыла ўвечары рабочы квартал каля мэханічных майстэрань і арыштавала звыш 100 савецкіх грамадзян. Па вуліцах ходзяць узмоцненыя патрулі. Пры паліцыі арганізованы спэцыяльныя атрады на матацыклетах і аўто.

8-га і 9-га жніўня спынілі работу звыш 3-х тысяч служачых К.-Ўсх. чыг.—савецкіх грамадзян. На многіх станцыях і прадпрыемствах чыгункі савецкія служачыя спынілі работу ў поўным складзе і падалі ў адстаўку. Адміністрацыя К.-Ўсх. чыг. загадала ня прымаць заяў аб адстаўцы, але гэта не дало вынікаў. 9-га жніўня каля станцыі Стары Харбін вышоў з рэек таварны цягнік. **У Дайлары ідуць вялікія ваенныя падрыхтаваньні. У ваколіцах гораду шмат войск, якія капаюць акопы і будуюць умацаваньні. Са складаў К.-Ўсх. чыг., забіраецца шмат матар'ялаў. Будынкі чыгуначных школ заняты войскам, якое ў іх раскватэравана.**

У апошнія дні на станцыі Манчжурыя таксама арыштавана 60 савецкіх грамадзян за самазвальненьне са службы на К.-Ўсх. чыг. Манчжурскія ўлады разглядаюць самазвальненьне, як спробу забастоўкі.

Штаб аховы Харбіну

ТОКІЁ, 10. У зьвязку з масавымі самазвальненьнямі савецкіх грамадзян, адданы загад аб узмоцненай ахове чыгункі, арганізаваны штаб аховы Харбіну, які абвясьцілу, што ўсе ненадзейныя элэмэнты будуць арыштаваны і строга пакараны. Ненадзейнымі элэмэнтамі будуць лічыцца ўсе асобы, якія ня ўнойдуць сабе пэўных заняткаў. (Пад гэтую катэгорыю, відавочна, падвозяцца беспрацоўныя, якія самавольна пакінулі службу. Такіх некалькі тысяч). Харбінскія газэты в мэтаю супакоіць насельніцтва, зноў пускаюць чуткі, што Серабракоў прыбыў на ст. Таўліна для перагавораў.

Канцэнтрацыя японскіх войск

ТОКІЁ, 12. Па атрыманых з Токіё вестках у Макіохэзе сканцэнтравана японскае войска, 1.000 чалавек з кулямётамі, палявымі гарматамі і бранявікамі.

Крушэньне цягніку ля Харбіна

ТОКІЁ, 10. Харбінскі карэспандэнт «Дэмпо Цусін» падае, што 9-га жніўня цягнік № 51 вышоў з рэек ля Харбіну. Разьбіта 28 вагонаў і паранена 7 кандуктароў. У Харбіне як і раней атмасфэра тэрору. Паводле вестак «Ніці-Ніці» за апошнія два дні в чыгункі звольнена каля тысячы савецкіх служачых. На станцыі Манчжурыя скапілася шмат савецкіх грамадзян, якія знаходзяцца пад вартаю салдат і пазбаўлены магчымасьці зьвярнуцца на бацькаўшчыну.

Усе аддзяленьні Д.-Усх. банку закрываюцца

ТОКІЁ, 12. Старшыня праўленьня Д.-Усх. банку заявіў аб закрыцьці ўсіх аддзяленьняў банку ў Кітаі. Цэнтральная кантора Дальбанку ў Харбіне закрыецца пасьля сходу акцыянэраў у бліжэйшыя дні.

Белагвардзейцы рыхтуюцца

ХАРБІН, 12. У мясцовым афіцыёзе Гун-Бао зьмешчана паведамленьне аб тым, што кітайскае камандваньне, в мэтаю прадэманстраваць сваю ваенную «магутнасьць» адправіла на станцыю Манчжурыя 10 самалётаў, а ў Хайлар выслалі 3 дадатковых батальёны Хэйлун-цьвянскіх войск і некалькі самалётаў і бранявікоў.

Па словах агэнцтва **«патаемныя падрыхтаваньні расійскіх белагвардзейцаў для нападу на сваіх чырвоных ворагаў на той бок мяжы,** робяць задачу манчжурскай улады нязвычайна цяжкай, бо ўсякі напад на савецкія войскі наўхільна будзе мець вынікі для кітайскіх войск».

Манэўр бандыта Чан Кай-шы

ТОКІЁ, 10. Шанхайскі карэспандэнт газэты «Зі-Зі» паведамляе, што Чан Кай-шы і Ван Чжэн-Цін запрапанавалі Чжу-Шао-Яну затрымацца на станцыі Манчжурыя яшчэ некаторы час з тым, каб потым зьвярнуцца да Лігі Нацый са скаргаю на «няпрымірымую» пазыцыю савецкага ўраду. Такім шляхам нанкінскі ўрад спадзяецца атрымаць сымпатыі рэшткі дзяржаў.

Паведамленьне ТАСС

У зьвязку з чуткамі аб перагаворах, якія нібы адбываюцца паміж былым павераным у справах Кітая у СССР Чу Шао-янам і прадстаўніком СССР, ТАСС упаўнаважаны паведаміць наступнае:

7-га жніўня Чжу Шао-ян прыбыў на станцыю Манчжурыя, зьвярнуўся па тэлеграфу да тав. Карахана з просьбаю камандыраваць на граніцу паўнамоцнага савецкага прадстаўніка для абмеркаваньня ўсіх пытаньняў, зьвязаных з канфліктам на К.-Ўсх. чыг., на вырашэньне якіх ён нібы ўпоўнаважаны Нанкінам.

8-га жніўня тав. Караханам быў пасланы адказ. У ім т. Карахан на падставе ранейшых вусных перагавораў паміж Мельнікавым і Цаем, якія паказвалі, што кітайская ўлада лёгка адмаўляецца ад сваіх уласных прапаноў, заначыў, што калі Чжу-Шао-Ян мае перадаць адказ на вядомы яму ліст Чжан-Сюэ-Ляну і папярэдніх ноты савецкага ураду, дык яму прадастаўляецца магчымасьць гэта зрабіць у пісьмовым выглядзе па тэлеграфу, або праз 86-ты разьезд.

9-га жніўня была атрымана новая тэлеграма ад Чжу Шао-яна, у якой гаворыцца, што ён ня можа рабіць ніякіх пісьмовых прапаноў і лічыць неабходным вырашэньне ўсіх спрэчных пытаньняў шляхам пасылкі спэцыяльнага ўпоўнаважанага на ўвесь час перагавораў з ім, або даезд яму (Чжу Шао-Яну) паездкі ў Маскву для асабістага спатканьня з тав. Караханам.

З прычыны таго, што гэты адказ пана Чжу Шао-Яна ня ўносіць нічога новага, Нарком. замежных спраў пастанавіў устрымацца ад адказу на яго, абмежаваўшыся адказам, які ім быў ужо даны 8-га жніўня.

ПОЛЬСКАЯ РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЯ ДЭЛЕГАЦЫЯ Ў МАСКВЕ

БУРА НАБЛІЖАЕЦЦА

Польская дэлегацыя: рабочыя, сяляне, служачыя, прадстаўнікі польскага пралетарыяту і рэвалюцыйнага сялянства.

Дэлегатаў абралі польскія рабочыя на фабрычных масоўках і сяляне—на сваіх сходах. Яны атрымалі наказ: едзьце ў СССР, даведайцеся праўду і раскажэце яе нам!

Польскі фашысцкі ўрад не дазволіў дэлегатам ехаць у СССР, таксама, як не дазволіў дэлегатам прапоўных палкаў СССР ехаць у Польшчу. Вось яна сучасная кітайская сьцяна.

Але польскія рабочыя знайшлі шлях да СССР. Аб тым, як яны прыехалі раскажа гісторыя тады, калі ад «величия» Пілсудзкага і фашызму застануцца толькі адны ўспаміны.

Дэлегацыя прыехала. Яна была горача спаткана рабочымі Масквы. І вось яна расказвае...

***

Турма, засьценак, пыткі, аб гэтым расказвае амаль кожны дэлегат на аснове ўласнага вопыту.

— Вы памятуеце 31-ую камэру ў Макатоўскай катаржнай турме,—кажа тав. Ланцуцкі.

— Гэта была залатая клетка,—гаворыць таварыш Ланцуцкі ў параўнаньні з тым, што зараз адбываецца ў польскіх турмах.

Абмяжоўваецца колькасьць кніг. А вы-ж ведаеце, чым зьяўляецца кніга для палітзьняволенага? Гэта—паветра для яго лёгкіх. Абмяжоўваецца колькасьць газэт. Не дазваляецца перадаваць кнігі і газэты з камэры ў камэру. Разьбіваюць прадуктовыя камуны. Імкнуцца прымусіць палітзьняволеных стаяць у часе вячэрняй пераклічкі. Колькі крыві пайшло на барацьбу з гэтай вгіднасьцю. Дзікі разгул фашызму, бізун, штык, засьценкі—на парадку дня...

1.500 арыштаваных у Лодзі 1-га жніўня

— 19-га ліпеня,—расказвае беспартыйны рабочы з Лодзі,—у сувязі з нападам на Кітайскую чыгунку ў Лодзі, у адным з буйнейшых цэнтраў Польшчы, быў арганізован мітынг пратэсту. Даўно Лодзь ня бачыла такое колькасьці рабочых на мітынгу. На двох мітынгах, па праверaных даных, было каля 30-ці тысяч рабочых. **Паліцыя зьвярэла, конная і першая галёпам і з прымкнутымі штыкамі кідалася ў самую гушчу рабочых.**

Разагналі мітынг.

Але гэтыя 30 тысяч чалавек на вуліцах Лодзі сьведчаць аб тым, як чула рабочая Польшчы прыслухоўваюцца да таго, што робіцца на далёкіх акраінах СССР. Пагроза нападу імпэрыялістых на СССР вывела на вуліцу ткачоў і ткачых,—30 тысяч лодзінскіх тэкстыльшчыкаў.

Паліцыя, навучаная вопытам 19-га ліпеня, сканцэнтравала 1-га жніўня ў Лодзі ўсе свае сілы (прышла дапамога з іншых гарадоў) і разагнала першажніўеньскую дэманстрацыю.

Арыштавана 1.500 чалавек.

1-га жніўня адбывалася ў Лодзі антымілітарысцкая канфэрэнцыя, у якой удзельнічала 120 дэлегатаў ад фабрык. Усю канфэрэнцыю арыштавалі і да гэтага часу лёс арыштаваных невядомы.

У Варшаве, ня гледзячы ні на што, рабочыя правялі свае раённыя дэманстрацыі.

***

Жыцьцё рабочых і сялян ў Польшчы

— Усе фабрыкі ў Лодзі,—расказвае другі рабочы, немец, член нямецкай сацыял-дэмакратыі (ёсьць у Польшчы і гэткая партыя, якая аб'яднае выключна нямецкіх рабочых),—работаюць тры дні ў тыдзень, у адну зьмену. **Рабочы зарабляе 9-12 злотых у тыдзень (два рублі—два р. 60 к.).**

Нават старыя лодзінскія рабочыя не памятуюць такога гора і галечы.

У Лодзі, па афіцыйных даных, 40 тысяч беспрацоўных, з якіх толькі трэцяя частка атрымлівае дапамогу ды і то ня поўнасьцю. У рабочых кватэрах—голад і беднасьць.

Крышку лепш абстаіць справа ў Дамброўскім вугольным басэйне, дзе рабочыя зарабляюць у сярэднім сто злотых (20 р.) у месяц. Гэтакія-ж прыблізна стаўкі і ў мэталюргічнай прамысловасьці.

***

На вёсцы адбываецца клясавая барацьба, Пілсудзкі ідзе па сьлядох Пятра Аркадзевіча Сталыпіна і вырошчвае кулакоў. Аграрная рэформа абярнулася ў сродак акруглення кулацкіх гаспадарак. Кулак купляе зямлю, сельска-гаспадарчыя машыны, кулак расьце, павялічвае сваю гаспадарку, становіцца малым абшарнікам-фэрмэрам. Такі кулак зьяўляецца адным з моцных падмуркаў рэакцыі польскага фашызму.

А бядняк? Бядняк знаходзіцца ў кабале ў кулака. Становішча бедняка да таго бязвыхаднае, што ён стыхійна хапаецца за зброю.

Беднякі, сельска-гаспадарчыя рабочыя часта захоплываюць панскія маёнткі, забіваюць паноў. Паліцыя прымушана такія сядзібы браць штурмам па ўсіх правілах ваеннай стратэгіі.

Рэвалюцыйны рух польскага сялянства расьце. Лепшым доказам быў апошні першы май. Сяляне стыхійна прыходзілі ў горад з чырвонымі сьцягамі, каб удзельнічаць у першамайскай дэманстрацыі, якія арганізоўваліся камуністымі. Гэтак было ў Любліне, у Жэшове, у Белай-Падляскай і ў радзе іншых месц. Сялянам прыходзілася прарывацца ў горад праз заградзіцельныя атрады.

І ўсё-ж, шмат тысяч сялян прымала ўдзел пад сьцягамі камуністычнай партыі ў першамайскай дэманстрацыі.

***

Баявы атрад фашыстых, яго жалезны кулак «Стралок» разлагаецца. У сучасны момант і думаць нельга аб жалезнай дысцыпліне і аб згуртаванасьці «Стралка». А «Стралок», які налічваў у 1927 годзе 300 тысяч чалавек быў гонарам фашызму. Ён быў прадназначаны для вулічных боек, для грамадзянскай вайны, для таго, каб разграміць рэвалюцыю, каб фізычна зьнішчыць рэвалюцыйны авангард, камуністычную партыю.

Зараз «Стралок» разлагаецца. Аддзелы бунтуюцца. Частка моладзі ўходзіць з «Стралка», а частка пераходзіць, разам з асобнымі стралковымі арганізацыямі, да камсамолу.

У гэтым таксама адбіваюцца глыбокія сьляды жудаснага эканамічнага крызісу, які перажывае Польшча. Гэты крызіс разьядае нутро фашызму, ён зьяўляецца лепшым арганізатарам рэвалюцыйных сіл Польшчы.

***

— Калі-ж ударыць гром рэвалюцыі? — Мы ня ведаем, калі. **Але што бура набліжаецца, гэта—факт. Мы ўсё зробім, каб падзеі нас не засталі знянацку,—гэтак кажуць беспартыйныя польскія рабочыя пасьля двухдзённага прабываньня ў СССР.**

Рабоча-сялянская дэлегацыя Польшчы выехала з Масквы для азнаямленьня з жыцьцём Саюзу

МАСКВА, 12. Дзьве групы рабоча-сялянскай дэлегацыі Польшчы, Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі выехалі з Масквы для азнаямленьня з жыцьцём Саюзу. Першая група, у склад якой уваходзяць старшыня дэлегацыі т. Ото Мац, Ланцуцкі і інш. накіраваліся па маршруту Масква—Арцёмаўск—Харкаў, Растоў, Уладзікаўказ, Тыфліс—Баку. Другая група наведае Харкаў, Горлаўку, Дняпропятроўск, Аляксандраўск, Севастопаль. Трэцяя група на чале з Перам, якая выяжджае з Масквы сёньня, наведае Арэхава-Зуева, Івана-Вазьнясенск, Кінешму, Балахну, Ніжні-Ноўгарад і Сталінград. (ТАСС).

Гаагская канфэрэнцыя у тупіку

НЯПРЫМІРЫМЫЯ ПАЗЫЦЫІ АНГЛІІ І ФРАНЦЫІ

Спрэчка ідзе з-за 45 мільён. марак у год

АНГЕЛЬСКАЯ І ФРАНЦУСКАЯ ДЭЛЕГАЦЫІ ПАСВАРЫЛІСЯ ЗА ПАДЗЕЛ ЗДАБЫЧЫ

ГААГА, 12. У нядзелю ў Гаазе адбываліся прыватныя перагаворы паміж кіраўнікамі дэлегацый галоўных зацікаўленых дзяржаў. Перагаворы прасьледвалі падвойную мэту: папершае, прымірыць Сноўдэна з французкай дэлегацыяй, якая лічыла сябе зьняважанай рэзкімі выразамі Сноўдэна ў яго прамове на апошнім пасяджэньні фінансавай камісіі, падругое—**знайсьці выхад з тупіку, створанага няпрымірымымі пазыцыямі Англіі і Францыі.** Першая мэта была дасягнута пасьля таго, як Сноўдэн выказаў жаль з прычыны зьняважлівага тону сваіх заяў. Інцыдэнт абвешчан вычарпаным.

Што-ж датычыць другой мэты, то перагаворы скончыліся на тым, каб згодна ангельскаму патрабаваньню, фінансавая камісія абмяркоўвала у першую чаргу пытаньне аб пастаўках натурай. Аднак, пры перагаворах не намецілася збліжэньня паміж супярэчлівымі пунктамі погляду. (ТАСС).

МАКДАНАЛЬД ВІТАЕ ЦЬВЁРДУЮ ПАЗЫЦЫЮ СНОЎДЭНА

ГААГА, 12. Ангельская дэлегацыя на гаагскай канфэрэнцыі паведаміла, што Сноўдэн атрымаў тэлеграму ад Макдональда, у якой апошні вітае яго «цьвёрдую пазыцыю, абяцае яму поўнае падтрыманьне і прапануе працягваць рашучую абарону ангельскіх патрабаваньняў». У колах канфэрэнцыі адзначаюць, што гэта тэлеграма разбурае французкія надзеі на супярэчнасьці паміж Макдональдам і Сноўдэнам.

ЖОРСТКАЯ БАРАЦЬБА НА ГРАШОВЫМ РЫНКУ

ГААГА, 12. На рэпарацыйнай канфэрэнцыі адначасова з спрэчкамі ў палітычнай камісіі адбываецца таксама жорсткая барацьба на грашовым рынку, якая прыняла асабліва рэзкія формы, калі быў высунут плян стварэньня банку міжнародных разьлікаў. Імпэрыялістычныя дзяржавы імкнуцца ўмацніць свае пазыцыі пры падыходзячых перагаворах аб гэтым. Асноўны сродак барацьбы—павялічэньне сваіх залатых запасаў за лік залатых запасаў працаўнікоў. У гэтай барацьбе Англія цярпіць няўдачы. Францыя і ПАЗШ робяць закупкі золатам у Англіі. Запас урадавых банкаў ПАЗШ павялічыўся на 347 мільёнаў долараў, залаты запас французкага банку на 245 мільёнаў долараў, залаты-жа запас ангельскага банку зьменшыўся за гэты пэрыяд на 60 мільёнаў долараў. Гэтыя акалічнасьці злумачацца выступленьні ангельцаў супроць вялікіх паўнамоцнцтваў банку міжнародных разьлікаў, а таксама жаданьне ангельцаў дабіцца стварэньня банку ў Лёндане. (ТАСС).

СПРЭЧКІ ПА ПЫТАНЬНІ АБ ПАСТАЎКАХ НАТУРАЮ

ГААГА, 12. На сёньняшнім пасяджэньні фінансавай камісіі працягваліся дэбаты аб пастаўках натурай. Нямецкі дэлегат зазначаў, што пытаньне аб пастаўках натурай закранае справядлівыя інтарэсы Нямеччыны. Пастаўкі натурай ня могуць быць скарочаны без таго, каб ня былі пахістаны асновы пляну Юнга.

Адказваючы на скаргі ангельскага дэлегата, які зазначыў на папярэднім пасяджэньні на цяжкае становішча ангельскага экспарту, нямецкі дэлегат у сваю чаргу спасылаўся на надзвычайна цяжкае эканамічнае становішча Нямеччыны. Паводле яго слоў, доля Нямеччыны ў сусьветным экспарце, якая складала ў 1913 годзе 12,7 проц., упала ў 1928 годзе да 9,13 проц. Разьмеры нямецкага экспарту ў 1928 годзе былі на 20 проц. ніжэй даваенных. Таксама скараціўся, у прыватнасьці, экспарт вугал

Першы Усебеларускі зьлёт юных піянэраў

Якую зьмену мы выхоўваем

(З дакладу т. Буклей на ўсебеларускай канфэрэнцыі піянэраў)

АД «ДЗІЦЯЧАЙ КАМУНЫ»—ДА 80-ТЫСЯЧНАЙ АРМІІ ЮНЫХ ПІЯНЭРАЎ

Тыя, хто былі ўдзельнікамі першай дзіцячай камуністычнай арганізацыі, даўно ўжо сталі дарослымі грамадянамі, частка з іх знаходзіцца ў радах ЛКСМБ і КП(б)Б.

Гэта было ў 1922 годзе. Дзеці рабочых Менску арганізаваліся. Некалькі дзесяткаў хлапчукоў і дзяўчынак стварылі ў БССР «1-ю Дзіцячую Камуну».

Далей—дружыны «юных спартакаўцаў». У 1923 г. гэтыя дружыны пачынаюць расьці. У 1924 г. XIII партыйны зьезд перайменаваў арганізацыю «Юны Спартак» у «Дзіцячую Камуністычную арганізацыю юных піянэраў імя Леніна».

«Старыя» памятуюць жыцьцё гэтай маладой арганізацыі. Яны памятуюць так званы «Трубны пэрыяд», калі адзінымі заняткамі арганізацыі была труба і бясконцая маршыроўка.

Яны памятуюць так званы «навучальны пэрыяд», калі труба выціскаецца цяжкай палітграматай, якую кіраўнікі падносілі дзецям. Кіраўнікі захапляліся рознымі «праблемамі», а дзеці... сумавалі.

Піянэры не маглі здаволіцца такім становішчам. Яны шукалі новых форм, новых мэтадаў. І знайшлі. Знайшлі іх ў «трэцім пэрыядзе»—працоўным. Практычная праца стала грунтоўным лёзунгам дзіцячага руху, самадзейнасьць—асноўным вагаром штодзённага жыцьця.

І толькі ў працоўным трэцім пэрыядзе піянэры адчувалі сапраўдную карысьць сваёй работы.

Арганізацыя вырасла. З маленькай «Дзіцячай Камуны», з невялічкіх атрадаў «Юных спартакаўцаў», **яна вырасла ў магутную армію юных піянэраў-ленінцаў, якая налічвае ў сваіх радах каля 80 тысяч дзяцей.**

ЮНЫЯ ЛЕНІНЦЫ ЗА РАБОТАЙ

Дзеці імкнуцца да калектыўнага жыцьця, да калектыўнай працы. Вось заява піянэра **Гарадкоўскага** атраду (Глускі раён, Бабруйская акруга): «Прашу ячэйку ЛКСМБ прыняць мяне ў арганізаваны камсамольскі калектыў. Я ад бацькі аддзяляюся, і ён мне выдае карову. Прашу ячэйку раз залічыць мяне членам вашага калектыву».

Такіх заяў, пісьмовых і вусных ёсьць пямала. Гэта—кавалак новага жыцьця, імкненьня піянэраў. Дзеці на практыцы дапамагаюць справе калектывізацыі, узьнаўленьню ўраджайнасьці сельскай гаспадаркі.

Смалявіцкая піянэрарганізацыя ачысьціла ў раёне 1.000 пудоў насеньня бядняцкай часткі гаспадароў.

Кастрычнікавы атрад вёскі Карпілаўка (Глускі раён) абышоў 120 двароў і праверыў, як прарастае насеньне ў сялян. Гэты-ж атрад вышачыў **ручну** кніганошу, якія распаўсюджвалі шмат с.-г. літаратуры.

Вучні Юравіцкай школы (Мазырскай акр.) разьбіліся на 6 груп па 18 чал. ў кожнай і накіраваліся ў вёску ў паход за ўраджай. Паход ахапіў 6 буйнейшых насельніцкіх пунктаў з лікам 1.000 двароў.

«Далоў трохполку»—выкінулі лёзунг піянэры. Арганізавалі вечар. Зацікавілі сялян. Пайшлі потым па хатах да сялян, агітавалі за культурнае вядзеньне гаспадаркі. Вось вынікі, падведзеныя піянэрамі.

Усімі групамі прадана 246 брашур па пасеўкампаніі, 60 партрэтаў Леніна. Завербавана 63 падпісчыкі на «Сялянскую газэту», падана заявак у сельгаставарыства на 200 пудоў штучнага ўгнаеньня.

Лічбы збору піянэрамі попелу, жалезнага лому і папяровай макулятуры, лічбы падпіскі дзяцей на пазыкі індустрыялізацыі, актыўны ўдзел піянэраў у справаздачна-перавыбарчай кампаніі—усё гэта яскравая ілюстрацыя рэальнай, канкрэтнай дапамогі з боку дзяцей у правядзеньні сур'ёзных палітычных кампаній, у ажыцьцяўленьні штодзённых задач, пастаўленых партыяй і савецкім урадам.

НАКІРАВАЦЬ УВАГУ НА ЎЗМАЦНЕНЬНЕ СЛАБЫХ ВУЧАСТКАЎ

Піянэры сталі актыўнымі будаўнікамі школы. У шмат якіх школах піянэры дабіліся гарачых сьнеданьняў. Па ініцыятыве піянэраў праводзіліся калектыўнае набыцьцё дзяцьмі пазык індустрыялізацыі. Ліквідацыя няпісьменнасьці сярод бацькоў, уцягненьне дзяцей рабочых у школу—усё гэта прыклады карыснай работы, прыклады дзейнасьці піянэрскай арганізацыі.

Аднак, на фронце камуністычнага выхаваньня дзяцей у школах мы ягнчэ часамі ня зусім добра спраўляемся. Ганебныя факты антысэмітызму і розных колераў шавінізму і дагэтуль ня зьнішчаны ягнчэ ў сьценах савецкай школы.

У некаторых школах пры перавыбарах органаў самакіраваньня мы мелі канкрэтныя праяўленьні гэтых школьных настрояў.

Попом, ксяндзом, рабінам удаецца перацягнуць да сябе ня толькі радавых вучняў, але і некаторую частку піянэраў. Факт—у мінулую зіму ў часе так званага «ганеньня» 15 піянэраў-вучняў наведалі папа і ксяндза. Ганьба.

Зразумела, што ўсё гэта не выпадкова. Клясавы вораг робіць усе захады, каб зашкодзіць справе камуністычнага выхаваньня дзяцей.

Тым больш мы павінны ўзмацніць наш уплыў у школах, уцягнуць у піянэрскія атрады усё больш і больш дзяцей.

Камсамол і піянэрарганізацыя ўжо распачалі барацьбу з адмоўнымі зьявішчамі ў школах. Гэтую барацьбу трэба працягваць.

Школа павінна стаць сапраўды **працоўнай, савецкай школай,** яна павінна выхоўваць зьмену ў ленінскім духу.

ШЫРЭЙ РАБОТУ СЯРОД НЕАРГАНІЗАВАНЫХ ДЗЯЦЕЙ

Перад дзіцячай камуністычнай арганізацыяй стаіць важнейшая задача: весьці штодзенную сыстэматычную работу сярод неарганізаваных дзяцей.

Гэта галіна работы пастаўлена дрэнна. Узяць хоць-бы піянэрскі друк. Кожнаму зразумела, якую вялікую выхаваўчую і арганізатарскую ролю адыгрывае друк. Між тым, тыраж піянэрскага друку вынімаецца. Па Беларусі ў маі выпісвалася звыш 6.000 экзэмпляраў «Пионерской Правды», а зараз... каля 3-х з паловаю тысяч. Часопіс «Бажак» выпісвалася ў маі ў ліку 800 экзэмпляраў, а зараз—635.

Ягнчэ горш з «Беларускім Піянэрам». З 3.000 экзэмпляраў, тыраж гэтай газэты звыціўся да... .1200 экзэмпляраў. Лік дзіцячых карэспандэнтаў паменшыўся з 150 да 25-30 дзяцей.

Работа сярод неарганізаваных дзяцей разгарнулася толькі пачатку зьлёту.

Трэба, каб гэтая работа была сыстэматычнай, каб яна праводзілася ў больш шырокіх размахах.

Хроніка зьлёту

11-га жніўня ўся праца зьлёту праводзілася ў саўдзе «Прафінтэрн». Раніцай адбывалася Усебеларуская канфэрэнцыя, увечары—спаборніцтва па фізкультуры і вечар самадзейнасьці піянэраў.

Учора з 10 да 2 гадзін дня адбываўся працяг фізкультурных спаборніцтваў.

А 3-й гадзіне дня піянэры выйшлі ў лагеры чырвонаармейцаў, дзе адбыліся вайсковыя спаборніцтвы.

Сёньня—урачысты вечар 3-х пакаленьняў.

Сёньня з раніцы па горадзе будзе адкрыты спаборнічаньні збору ў карысьць дзіцячых камуністычных арганізацый у капіталістычных краінах.

Заўтра—дзень провадаў дэлегатаў да моў і на ўсесаюзны зьлёт піянэраў.

Расхлябанасьць у будаўніцтве ня спыняецца

На адкрытым пасяджэньні парт'ячэйкі Белдзяржбуду, што адбылося гэтымі днямі быў заслуханы інфармацыйны даклад аб ходзе будаўніцтва ў Менску.

Паводле матар'ялаў гэтага дакладу і спрэчак, што разгарнуліся пасьля яго, папярэднія вынікі будаўнічага сэзону ў Менску прадстаўляюцца досыць сумнымі. Пры наяўнасьці нязначных дасягненьняў, шмат буйных сур'ёзных недахватаў у рабоце.

Перш за ўсё наглядаецца разрыў паміж праектаваньнем і будаўніцтвам: адставаньне рабочых чарпяжоў ад агульнага тэмпу будаўніцтва, пры невыстарчальнай прапрацоўцы чарпяжоў (памылкі, няўвязкі, нявыясьненасьці). Акрамя таго, распрацаваныя праекты разыходзяцца з апошнімі дырэктывамі ў сэнсе патаненьня і рацыяналізацыі: усё ягнчэ робіцца вельмі тоўстыя сьцены, ужываюцца жалезныя канструкцыі там, дзе можна абыйсьціся без іх; замест драўляных бэлак прызначаюцца жалезныя, якія зьяўляюцца вельмі дэфіцытным матар'ялам. Якасьць матар'ялаў асабліва драўніны даволі нізкая, прычым побач з гэтым цана на іх ня зьніжаецца, а ў некаторых выпадках нават павялічваецца.

Якасьць работ таксама ня зусім добрая. Асабліва дрэнна выконваюцца работы па атынкаваньні, якія досыць часта прыходзяцца перарабляць. Прычына хаваецца ў няправільнай дазіроўцы росчыны: замест алябастру дасцца занадта многа цэмэнту, чаму атынкоўка адвальваецца. Прыклад—фабрыка Менпэй,—дзе прышлося затраціць некалькі тысяч рублёў на пераатынкоўку. Сталяры, замест таго, каб клеіць дзьверы, зьбіваюць іх цьвікамі.

Гэта нізкая якасьць работ, акрамя неразумных адносін да іх, выклікана таксама нястрымнай пагоняй за нормай выпрацоўкай, супроць чаго трэба прыняць меры.

Вылучэнцца няўвязка ў расцэнках, іх няжыцьцёвасьць: аказваецца, што падносчыкі пры каменшчыках атрымліваюць больш саміх каменшчыкаў.

Зьніжэньне сабекошту рабсілы дае досыць стракаты малюнак: каменшчыкі —8 проц., дапаможныя да іх—2 проц., атынкоўшчыкі—5 проц., крытцы—3 проц., электраманцёры—8 проц. Сярэдняе зьніжэньне па рабсіле дае 2,5 проц., а ў адносінах усяго кошту будаўнічай прадукцыі, гэта складае толькі 0,6 проц.

Працдысцыпліна зусім не на вышыні. Наглядаюцца выпадкі непадпарадкаваньня прарабам, ухіленьне ад цяжкіх работ, выхад на работу ў нецьвярозым выглядзе, прагулы з месяцу ў месяц расьце. Занепад працдысцыпліны тлумачыцца часткова слабым рэагаваньнем з боку прарабаў, нежадаючых абвастраць адносіны з парушальнікамі працдысцыпліны.

Прадукцыйнасьць працы павышаецца слаба; работы вядуцца падседаўску, адсутнічае навуковая арганізацыя працы. Нескарыстаны час у цесьляроў надзвычайна вялікі, складаючы звыш 2-х гадзін або 25 проц. рабочага дня. Гэты час траціцца на гутаркі, курэньне, тачэньне інструмантаў і г. д. Адчуваецца недахват у падрыхтаванай і навучанай кваліфікаванай рабсіле.

Скончыўшы ЦІП у рабоце ягнчэ не спрактыкаваны, напрыклад, каменшчыкі-атынкоўшчыкі працуюць на разрадах вучняў.

Тэхніка бэзапаснасьці ў загоне, адсутнічае інструктаж у справе абыходжаньня з мэханізмам, што вядзе да псаваньня апошніх і зьвязана з калецтвамі, якія могуць часамі прывесьці да сьмерці.

Кіруючы склад—тэхнікі, дзесятнікі—ня зусім здавальняючыя. Мала добрых прарабаў. Няма пісьменных дзесятнікаў. Якраз дзесятнікі-вылучэнцы (у Менску іх 11 чалавек) правялі сябе з добрага боку. Прарабы часамі няўважлівыя, інэртныя да лёсу будаўніцтва.

Сёе-тое робіцца па лініі рацыяналізацыі: ужываецца кладка без знадворных рыштаваньняў, робіцца плоскія цагельныя і жалеза-бэтонныя перамычкі. У гэтай галіне некаторы пералом заўважваецца. Вельмі ніякія дасягненьні ў галіне сацыялістычнага спаборніцтва, хоць зрух тут, бязумоўна, ёсьць.

Канчатковыя вынікі можна будзе падвесьці пры канцы будаўнічага сэзону.

Зьнішчыць выкрытыя сур'ёзныя недахваты і прабелы ў рабоце, ажывіць гэтую работу —вось агульная задача і адміністрацыі, і тэхнэрсаналу, і прафработнікаў на будаўніцтве, і парт'ячэйкі. Трэба супольнымі намаганьнямі ўдарыць па нашай расхлябанасьці ў галіне будаўніцтва—гэтага важнага вучастку ў барацьбе за ўздым сацыялістычнае гаспадаркі.

КУЛЬКІН.

Не забываць важнейшай задачы--

вярбоўкі перадавых рабочых і батракоў у рады партыі

Аб ходзе чысткі і праверкі вайсковых і вясковых ячэек КП(б)Б

Там, дзе арганізацыі правялі адпаведную падрыхтоўку, чыстка праходзіць пры актыўным удзеле беспартыйных мас: батракоў, беднаты і чырвонаармейцаў

Рад райкомаў недапушчальна аднёсься да справы растлумачэньня задач чысткі сярод беспартыйных працоўных мас

РЭЗАЛЮЦЫЯ ПРЭЗЫДЫУМУ І ПАРТКАЛЕГІІ ЦКК КП(б)Б

1. Праверка і чыстка вясковых і вайсковых ячэек КП(б)Б праходзіць у асноўным як пры дастатковым наведваньні праверачных сходаў членамі і канд. партыі, зацікаўленасьці і актыўным удзеле на гэтых сходах членаў ЛКСМБ, сел.-гасп. рабочых, бедноты, лепшай часткі серадняку, а ў вайсковых арганізацыях—чырвонаармейцаў, так і пры шырокім разгортваньні самакрытыкі, у асаблівасьці, у тых ячэйках, дзе добра пастаўлена масавая работа, правільна праводзіцца клясавая лінія партыі ў штодзённай рабоце ячэек і праведзена добрая папярэдняя падрыхтоўка да чысткі.

2. Побач з гэтым ЦКК КП(б)Б лічыць зусім ненармальным, што ў радзе месц, у зьвязку з слабай падрыхтоўкай некаторых ячэек і РК да чысткі і праверкі, а таксама і наогул іх слабай работы, разгортваньне самакрытыкі ўсё ягнчэ застаецца недастатковым і нават слабым, а ў радзе ячэек наглядаліся зьявішчы «кругавой парукі» і сямейственнага пакрываньня недахопаў ячэйкі і асобных партыйцаў. ЦКК КП(б)Б таксама лічыць зусім недапушчальным, калі з боку пасобных РК (Смалявіцкі і Заслаўскі—Мен. акр., Ліозьнянскі—Віц. акр., Чачавіцкі—Маг. акр., Крупскі—Аршан. акр., Петрыкоўскі—Мазыр. акр. і інш.) ня былі прыняты належныя меры па растлумачэньню шырокім масам, асабліва батрацтву і беднаце, задач партыі па чысткі і праверцы, у выніку чаго на некаторых праверачных сходах батрацтва і беднота выступалі не арганізавана і па сваёй актыўнасьці ня былі на чале беспартыйных мас, удзельнічаючых на праверсходах, што далэ магчымасьць імкненьня заможных элемэнтаў да кампрамэтацыі пасобных партыйцаў, якія цьвёрда праводзяць клясавую лінію партыі.

3. ЦКК КП(б) падкрэсьлівае, што ў рабоце РК і ячэек не ва ўсіх мясцох зварочваецца дастатковая ўвага пытаньням вярбоўкі ў партыю с. г. рабочых, батрацтва, і беднаты і што з боку АК і АКК няма належнай праверкі і практычнай дапамогі на выкананьні РК і ячэйкамі раней даных ЦК і ЦКК КП(б)Б дырэктыў па пытаньні росту партыі. У выніку гэтага, ня гледзячы на тое, што чыстка і праверка вясковых ячэек падыходзіць да канца, належнага пералому ў гэтай рабоце, за малым выключэньнем, ягнчэ ня маецца. Больш таго, у радзе месц нават у раённых работнікаў існуе думка, што ў іх «батракоў няма».

4. Адзначаючы, што праверкомы з работай па чысткі і праверцы вясковых і вайсковых ячэек у асноўным спраўляюцца, ЦКК КП(б)Б разам з гэтым падкрэсьлівае наступныя недахопы ў іх рабоце:—слабы вучот прысутных па праверсходах па сацыяльных групах (батрак, бедняк, серадняк), слабае вывучэньне актыўнасьці пасобных сац. груп з боку пасобных праверкомаў, недастаткова глыбокае вывучэньне і праверка работы ячэек, незаўсёды вычэрпываючая праверка паданых заяў і матар'ялаў на праверяемых партыйцаў, у зьвязку з чым маюцца факты значных зьмен пастаноў праверкомаў у асобных АКК. Гэтыя недахопы ў рабоце пасобных праверкомаў зьяўляюцца вынікам недастатковага жывога інструктаваньня і дапамогі з боку АКК і АК праверкомам у працэсе чысткі і праверкі.

5. ЦКК КП(б)Б адзначае два выпадкі мэшчання месца адмены работы двух праверкомаў па дзьвюх вайсковых ячэйках і назначэньня новай праверкі (Полацк), што зьявілася вынікам слабай падрыхтоўкі да чысткі і праверкі гэтых ячэек, слабай работы праверкомаў і несвалачасовай дапамогі ім з боку АКК, нестваральня спрыяючых умоў да чысткі і праверкі з боку кіруючага палітскладу праверяўшайся арганізацыі, на што трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу адпаведным вайсковым паліторганам.

У мэтах спраўленьня выяўленых недахопаў у далейшай рабоце па чысткі і праверцы,—аб'яднанае пасяджэньне Прэзыдыуму і Парткалегіі ЦКК КП(б)Б пастанаўляе:

1. АКК, АК і РК КП(б)Б прыняць усе меры па выяўленьні ў сябе вышэйпералічаных недахопаў і хуткага іх зжываньня, камандыраваць адказных прадстаўнікоў АК і АКК у раёны для жывога інструктаваньня і практычнай дапамогі праверкомам. Пры гэтым зьвярнуць асаблівую ўвагу праверкомаў, пры непасрэдным і актыўным удзеле РК і ячэек, на неабходнасьць таго, каб батрацтва і беднота на ўсіх праверачных сходах выступала арганізаванай і была на чале актыўнасьці па выяўленьні хворых зьявішч у рабоце, як ячэек у цэлым, так і паасобных партыйцаў, пры гэтым праводзіць вывучэньне і вучот палітычнай актыўнасьці паасобных сац. груп (батрак, бедняк, серадняк).

2. АК і РК партыі дабіцца рашучага пералому ў выкананьні дырэктыў ЦК і ЦКК КП(б)Б па пытаньні вярбоўкі ў партыю рабочых, батрацтва і беднаты, для чаго ўзмацніць масавую ячэйковую работу. АКК праверыць выкананьне гэтай дырэктывы.

3. Улічваючы тое, што чыстка і праверка вайсковых і вясковых ячэек выяўляе, побач з станоўчымі момантамі, многа хворых зьявішч, як:—слабую пастаноўку масавай работы, асабліва ў вясковых ячэйках, слабае разгортваньне самакрытыкі, у большасьці раёнаў слабае, альбо поўнае адсутнічаньне работы па ўцягненьні ў партыю батрацтва, рабочых, беднаты і калгасьнікаў, зусім слабае жывое кіраўніцтва і практычная дапамога з боку РК у рабоце ячэек і г. д. АКК разам з АК рэалізаваць вынікі чысткі і праверкі ў направку спраўленьня выяўленых праверкомамі недахопаў і замацаваньня актыўнасьці мас, для чаго зараз-жа прыступіць да вучоту, падагульненьня і аналізу вынікаў праверкі вясковых і вайсковых ячэек, паставіць іх на пырокае абгаварэньне Пленумаў АК, АКК і партактыву.

4. Улічваючы слабую папярэднюю падрыхтоўку да чысткі і праверкі вясковых ячэек (характарыстыкі і інш. матар'ялы ў большасьці не адпавядалі сапраўднаму становішчу ячэек), што ўскладняла работу праверкомаў,—АКК, АК і РК зараз-жа прыступіць да праверкі падрыхтоўкі сав. яч. і ячэек навучальных устаноў да чысткі.

5. Адзначаючы паасобныя выпадкі помсты і ганеньня з боку вычышчаных з партыі, альбо атрымаўшых спагнаньне ў адносінах да партыйцаў, альбо беспартыйных, якія выкрывалі іх у часе чысткі (забойства выключаным у Чэрвен. раёне бедняка, ў Віцеб. акр.—забойства члена сям'і)—ЦКК КП(б)Б зварочвае ўвагу ўсіх АКК, АК і РК, а таксама ўсіх партыйцаў на неабходнасьць рашучай барацьбы з падобнага роду выпадкамі.

ЦКК КП(б)Б падкрэсьлівае, што ў кожным выпадку ганеньня і помсты, у якой-бы яно форме не выяўлялася, неабходна вінаватых прыцягваць да самай суровай адказнасьці з перадачай справы ў суд.

ЦК КП(б)Б і Менскаму акругкому

10-ая Пухавіцкая раённая партыйная канфэрэнцыя шле свае камуністычнае прывітаньне ЦК КП(б)Б і Менскаму акруговаму камітэту КП(б)Б. Канфэрэнцыя запэўняе ЦК КП(б)Б і акругком, што пасьля чысткі партыйных радоў Пухавіцкая парт-арганізацыя ягнчэ з большай напружанасьцю павядзе барацьбу супроць усякіх праяў правага і «левага» ўхілаў і прымірэнцтва, на ўзмацненьні тэмпу калектывізацыі на раёне і ажыцьцяўленьні пастаноў 16-й партканфэрэнцыі і 12-га зьезду КП(б)Б.

Прымаючы пад увагу абвостранасьць міжнарэднага становішча СССР у сучасны момант, мы абяцаем узмацніць працу па вайнізацыі насельніцтва.

Хай жыве ЦК (КП(б)Б!

Хай жыве ЦК УсеКП(б)! **Прэзыдыум.**

Лепшыя рабочыя і работніцы ўступаюць у партыю

(МАЗЫР)

Ячэйка саўгасу «Дабрынь» (Каралінскі раён) складаецца з 7 членаў і 6 кандыдатаў партыі, якія ў пераважнай сваёй частцы зьяўляюцца рабочымі саўгасу.

Ня так даўно ягнчэ (год-паўтара таму назад), дзякуючы склокам і п'янству ў ячэйцы, праца ў саўгасе была не наладжана, і некаторыя з вакольных кулакоў ужо чакалі таго, што зьліквідуюць саўгас і разьмяркуюць зямлю. Але, не дачакаліся гэтага.

Склад ячэйкі, дзякуючы своечасова прынятым мерам, аднавіўся, і праца пачала ўзмацняцца. Толькі адна ягнчэ «маленькая» бяда: загадчык саўгасу кандыдат партыі, т. Рак ня любіць самакрытыкі, ён ня любіць, калі яго дзейнасьць крытыкуюць. Ён ня можа пры мірыцца з выступленьнямі рабочых, якія кажуць, што дзякуючы няўважлівасьці Рака пасадалася 20 пуд. мукі, згніла канюшына, што Рак здавальняе мукою свайго цесьця-папа, а ўсё гэта хвалявала рабочых саўгасу, яны аб усім гэтым сказалі на сходзе пры праверцы ячэйкі.

Праверачная камісія выключыла Рака з партыі, але матывіроўка выкліказ вялікае непаразуменьне. Праверачная камісія ў сваім пратаколе канстатуе, што Рак «атрымаў вымову за нетаварыскія адносіны да партыйцаў-рабочых саўгасу, трымаў сувязь з прыватнікамі і папоўскай сям'ёй, бюракратычна адносіўся да рабочых, слаба ўдзельнічаў у гаспадарцы, пасыўны да партжыцьця»..., а ў сваёй пастанове піша: «Выключыць Рака з партыі, але матывіроўка выклікае вялікае тыйнай і грамадзкай рабоце і непадрыхтаваўшага сябе да пераводу з кандыдатаў у члены партыі».

Па нашай думцы, тут вялікая супярэчнасьць, якую трэба выправіць.

Увагі заслугоўваюць наступны моманты, які выявіўся на праверачным сходзе. Ячэйка «Дабрынь» аб'ядная некалькі індывідуальнай сельскай гаспадарцы. Сярод гэтых партыйцаў седзянін-серадняк т. Анішчанка, правёўшы за апошні час вялікую працу па арганізацыі сяляк сваёй вёскі ў розныя аб'яднаньні: ён арганізаваў машыннае і начялярнае таварыствы, злучны пункт, арганізаваў калгас, які дзякуючы агітацыі заможных, не ўдалося ягнчэ аформіць. Уся гэта грамадзкая работа Анішчанка не спадабалася падкулачнікам, і таму яны прышлі на праверачны сход асьпаць яго брудам: «Анішчанка ня хоча ісьці ў калгас», Анішчанка быў у 1904 годзе старастаю» і г. д.

Групе падкулачнікаў не ўдалося ачарніць Анішчанку, ячэйка і беднота ахарактарызавалі яго зусім з другога боку.

Праверка ячэйкі «Дабрынь» узварушыла рабочых саўгасу, яны мацней прыняліся за ўзьнаўленьце савецкай гаспадаркі. Лепшыя рабочыя і работніцы паказалі сваю адданасьць партыі ўступленьнем у яе рады. К канцу работы праверачнай камісіі ў ячэйку былі паданы 4 заявы ад 2 рабочых і 2-х работніц аб прыёме іх у партыю.

Б. Ш.

На нарадзе загадчыц акружнаддзелаў

Справаздачна-перавыбарчая кампанія дэлегацкіх сходаў

Учора зранку ішлі спрэчкі па дакладу тав. Крэмер. Выступілі т. т. Лейкіна, Альшэўская, Чорнабродава, Змушко, Савіцкая і інш.

Пасьля заключнага слова т. Крэмер з дакладам аб справаздачна-перавыбарчай кампаніі дэлегацкіх сходаў выступіла тав. Бурава.

Перавыбары дэлегацкіх сходаў,—кажа дакладчыца,—праходзяць, як самастойная, асабліва важнасьці, палітычная кампанія. Яна павінна праходзіць пад лёзунгам:

— Дэлегацкія сходы зьяўляюцца пачынальнікамі актыўнага ўдзелу жанчын у сацыялістычным спаборніцтве ў горадзе і на вёсцы.

Рацыяналізацыя вытворчасьці, узьнаўленьце прадукцыйнасьці працы, зьніжэньне сабекошту, барацьба з прагуламі, п'янствам, за кваліфікацыю работніц у вытворчасьці, у саўгасах і калгасах на вёсцы, узмацненьне інтэрнацыянальнага выхаваньня,—усё гэта павінна стаяць у плане работы дэлегацкіх сходаў.

Далей т. Бурава кажа, што нашай чарговай і неадкладнай задачай зьяўляецца больш рашучае вылучэньне на кіруючую працу работніц і сялянак.

Справаздачная кампанія павінна быць закончана ў горадзе да 1-га верасьня, на вёсцы да 15-га верасьня.

Перавыбары дэлегацкіх сходаў маркуецца закончыць да 15-га кастрычніка. Перавыбарчая кампанія павінна мець оваёй мэтай палепшаньне аканага складу дэлегацкіх сходаў.

Беспартыйны ў ролі члена бюро

Ідзе чыстка партыйных радоў. Партыец, які сваёю працаю скампрэмэтаваў годнасьць члена партыі, тым самым страціў права ажыцьцяўляць дзе-б то ні было партыйна-палітычнае кіраўніцтва.

З гэтага вынікае, што партыйны апарат павінен працаваць так, каб усьлед за тым, як акруговая кантрольная камісія зацьвердзіць пастанову аб выключэньні таго ці іншага партыйца, былі апавешчаны ўстановы, дзе выключаны кіруе партыйна-палітычнаю працаю для прыняцьця адпаведных арганізацыйных мер.

Практыка паказвае, што парторганы гэтага парадку прытрымліваюцца ў адносінах месца службы выключанага, але як вядома, кожны партыец знаходзіцца ягнчэ на вучоце і па вайсковай лініі. І вось тут то акуратнасьць партапарату іншы раз кульгае.

Як довад, можна падаць наступны выпадак.

У мінулым годзе быў прызваны на перападрыхтоўку палітскладу разам з партыйцамі рабочы Белдзяржбуду **Пупель.** Як адзін з найбольш старых па ўзросьце ў роце, якая складалася толькі з адных партыйцаў, **Пупель** быў назначаны камандзірам узводу, абраны членам бюро ячэйкі і назначаны старэйшым групы па палітзанятках.

Лягернае калектыўнае жыцьцё партыйцаў найлепшым спосабам. Дапамагае вывяць кожнага члена партыі, азнаёміцца з яго паводзінамі і наколькі ён вытрыманы, як камуністы.

Таму ня дзіва, што ледзь пасьпеў Пупель акунуцца ў гэта калектыўнае жыцьцё, як яго грубыя адносіны да «падначаленых» і падхалімства перад начальствам зьвярнулі на сябе ўвагу партыйцаў. Адзін з таварышоў даў яму мянушку «фэльдфэбель». Гэта падхапіла ўся рота.

Праз пару тыдняў пасьля роспуску партыйцаў з лягеру, раптам стала вядома, што **Пупель ягнчэ год таму назад быў выключаны з партыі,** як асуджаны за эксплёатацыю маладых рабочых, ён зьяўляецца п'яніцай, а ў апошні час пачаў будаваць сабе дом.

Ня будзем ужо гаварыць аб тым, што **Пупель** сваімі ўчынкамі ашукаў даверэ партыі і Чырвоную армію, за што ён павінен быць адданы пад суд, але разам з гэтым парторганы павінны зрабіць і для сябе адпаведны вывад і паставіць справу так, каб у далейшым такія выпадкі не маглі паўтарацца.

СЯЛЯНСКІ

Па Савецкай Беларусі

Да аварыі на Добрушы



Папсаваны мост на р. Інуць

„Дзень Калектывізацыі" ў Гомельшчыне

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). **Дзень індустрыялізацыі ўзварушыў працоўнае сялянства акругі. Рад сялянскіх сходаў выкінуў пытаньне аб правядзеньні ў акрузе дня калектывізацыі.**

Па думцы бедняцкай, дзень калектывізацыі зьвяцца моцным ударам па кулаку і ўзмоцніць калгаснае будаўніцтва.

Дзень калектывізацыі мае быць праведзены 28 жніўня. Рабочыя гомельскіх прадпрыемстваў арганізуюць брыгады для дапамогі беднаце і калгасьнікам у правядзеньні асеньняй сяўбы.

Прафтэхнічныя курсы для рабочых

ГОМЕЛЬ, (наш кар.). **З восені гэтага году на прадпрыемствах акругі будзе адкрыты рад прафтэхнічных курсаў па павышэньні кваліфікацыі асобных груп рабочых.**

На папяровай фабрыцы «Гэрой Працы» будуць адкрыты курсы на 120 чал., на запалкавых фабрыках—на 200, на на мэтала-апрацоўваючых прадпрыемствах—на 120 чал., на дрэвапрацоўваючых на 40 чал.

Пад суд за невыкананьне пастаноў Наркамгандлю

ГОМЕЛЬ (наш кар.). **Акргандаль прыцягнуў да судовай адказнасьці Рэчыцкае і Падабранскае с.-г. крэдытныя таварыствы за невыкананьне загаду Наркамгандлю, акрвыканкому і РСІ аб вывазе жывёлы з межаў акругі.**

На самалёт „Магілеўскі селянін"

МАГІЛЕЎ (наш кар.). **Ва ўсіх мястэчках і вёсках акругі ідзе збор сродкаў на пабудову самалёту «Магілеўскі Селянін».**

На 8 жніўня, па няпоўных вестках сабрана на пабудову самалёту звыш 1500 руб.

Датэрміновая здача падаткаў

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). **У вёсках Веткаўскага і Хойніцкага раёну пачалася датэрміновая здача с.-г. падатку. Сяляне вёскі Высокае выклікалі на спаборніцтва па выплаце сельска-гаспадарчага падатку сялян бліжэйшых пасёлкаў. Селянін Мохараў унёс датэрмінова с.-г. падатак за тры тэрміны.**

* * *

ЗАСЛАЎЕ. (Наш кар.). **Селянін вёскі Ашмянцы Цяхановіч Андрэй першы заплаціў с.-г. падатак за 29-30 год.**

Справа бандыцкай шайкі

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). **Выязная сэсія Гомельскага акроуду окончыла разгляд справы бандыцкай шайкі з вёскі Вялікі Немкі. Суд прызнаў доказаным абвінавачваньне падоўдных у падпалах маемасьці актывістых, у забойствах і аграбленьнях.**

6 чалавек, на чале з былым старшынёй сельсавету Кірушыным, прыгавораны да расстрэлу. Тром з іх расстрэл заменены пазбаўленьнем волі з суровай ізаляцыяй на 10 год і з высылкай на 5 год з межаў БССР.

26 чалавек прыгавораны да розных тэрмінаў зьвяволеньня.

Да аварыі на Добрушы



Пабудова перамычкі

У лягеры кітайскай контр-рэвалюцыі

Кітайская грамадзкасьць усё ягнчэ знаходзіцца пад сьвежым уражаньнем правакацыйнага выступленьня нанкінскага ўраду. Поўная частка кітайскіх палітычных колаў зьдзіўляецца з повадзі харбінскіх падзей. Але асобы, добра знаёмыя з сапраўдным становішчам нанкінскага ўраду, лічаць, што захват К. Усх. чыг. і разрыў дыплёматычных адносін паміж СССР і Кітаем—толькі пасобныя зьвяньні плану, распрацаванага Чан Кай-шы і кампаніяй для ўмацаваньня свайго хісткага становішча.

Чан Кай-шы прыпоў да ўлады ў 1927 годзе пры непасрэдным падтрыманьні кітайскай буржуазіі і імпэрыялістых. Але Чан Кай-шы не апраўдаў надзей, ускладзеных на яго буржуазіяй. Аб'яднаньне Кітая засталося фікцыяй. Паасобныя ваенна-намешчыцкія групоўкі—гуансійская зграя, Фын Юй-сян, Ян Сі-шан і Чжан Сэю-лян як і раней аказваюць рэзкае супраціўленьне спробам Чан Кай-шы падпарадкаваць іх цэнтральнаму нанкінскаму ўраду. Для кітайскай буржуазіі ясна, што выбух новай грамадзянскай вайны ў Кітаі толькі пытаньне часу. Ня зроблена нанкінскім урадам нічога і ў зямельным пытаньні. Шанхайская, чжэцьзянская і гуандунская буржуазія зацікаўлена ў правядзеньні сякой-такой зямельнай рэформы, якая спрыяла-б пашырэньню ўнутранога рынку. Але ваенна-намешчыцкая частка контр-рэвалюцыйнага блёку, на якую апіраецца ўрад Чан Кай-шы, не зацікаўлена нават у малейшай зьмене цяперашняй сыстэмы землякарыстаньня ў Кітаі. Інтарэсы перадавой шанхайскай і паўднёвай буржуазіі і яе саюзьнікаў мілітарыстых і намешчыкаў у гэтым пытаньні процілеглыя. Урад-жа знаходзіцца цалкам у руках ваенных дідэраў, якія, апіраючыся на войска, вядуць сябе падыктатарску.

Паводзіны ваеншчыны выклікаюць вялікае незадаваньненьне ў кітайскіх буржуазных колах. Аб рэаладзе, што намячаецца ў лягеры контр-рэвалюцыйнага блёку сьведчыць рад фактаў. Найбольш характэрнае ў гэтых адносінах нядаўняе выступленьне выдатнага вучонага Гу Шы, зьвязаннага з найбольш перадавымі коламі кітайскай буржуазіі. Повадам для выступленьня Гу-Шы паслужыла дэкларацыя нанкінскага ўраду аб «правох чалавека». У гэтай дэкларацыі гаворыцца, што ніхто—ні аддзельныя асобы, ні арганізацыі ня маюць права парушаць асабістую свабоду і маемасныя правы грамадзян кітайскай рэспублік

Ці патрэбен Усесаюзны Камісарыят сельскай і лясной гаспадаркі

У разьвіцьці сельскай і лясной гаспадаркі СССР было некалькі найбольш яркіх пэрыядаў. Першы пэрыяд быў, калі сялянства ў саюзе з рабочай клясай і пад кіраўніцтвам кампартыі займалася канфіскацыяй буйных земляўладаньняў і перадачай іх у рукі працоўных; другі—пэрыяд залечваньня ран, якія былі нанесены гаспадарцы імпэрыялістычнай і грамадзянскай вайной і, нарэшце, наступіў трэці—пэрыяд карэннай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі на падставах будаўніцтва буйных савецкіх і калектыўных гаспадарак. Калі было магчыма працаваць у адсутнасьці ўсесаюзнага цэнтру сельскай і лясной гаспадаркі ў два першыя пэрыяды канфіскацыі і размеркаваньня зямель, аднаўленьня сельскае гаспадаркі да даваенных разьмераў, то абсалютна немагчыма зараз пры адсутнасьці ўсесаюзнага цэнтру, займацца сацыялістычнай рэканструкцыяй сельскае гаспадаркі на аснове індустрыялізацыі нашае краіны.

Матывы да арганізацыі ўсесаюзнага цэнтру сельскае і лясное гаспадаркі з майго пункту погляду зьяўляюцца наступныя:

1. Сельская і лясная гаспадарка не ўяўляюць з сябе гаспадаркі мясцовага значэньня, паколькі адны раёны саюзу здавальняюць патрэбы ў харчаваньні раёны нявытворчыя, другія раёны вырабляюць сыравіну для прамысловасьці. Напрыклад, Паўночны Каўказ вырашчвае найлепшую пшаніцу, якая служыць харчаваньнем і экспортам, ёнжа вырашчвае падсолнух і інш. БССР-жа вырашчвае добрую бульбу, якая служыць для тэхнічных і харчавых патрэб, БССР вырашчвае лён, як тэхнічную культуру, якая служыць сыравінай для г. мысловасьці і г. д.

2. Кіраўніцтва сельскай і лясной гаспадаркай ва ўсесаюзным маштабе было распылена. Так, напрыклад, перасяленьнем і калёнізацыяй ведаў Перасяленцкі Камітэт пры Цэнтральным Выканаўчым Камітэце Саюзу, хлопкаводзтвам—хлапковы камітэт, вэтэрынарыяй вэтэрынарны камітэт пры Савеце Працы і Абароны. І, нарэшце, створаны цэлы рад цэнтраў, як напрыклад, машына-трактарны цэнтр, акцыянэрнае таварыства па забесьпячэньні сродкамі вытворчасьці сельскае гаспадаркі, не гаворачы ўжо аб сельска-гаспадарчай каапэрацыі, саўгасах, падрыхтоўцы кадраў для сельскае і лясное гаспадаркі.

3. Адсутнасьць адзінага кіраўніцтва часта прыводзіць да непрымемных выніхаў як у пытаньнях падрыхтоўкі сыравінай і харчовай базы для прамысловасьці, так і ў пабудове прадпрыемстваў па забесьпячэньні сельскае гаспадаркі сродкамі вытворчасьці. Апошняе ў зьвязку з інтэнсіфікацыяй сельскае гаспадаркі паасобных раёнаў, у зьвязку з масавай калектывізацыяй бядняцка-серадняцкіх мас вёскі, набывае асаблівае значэньне, паколькі найбольшыя магчымасьці для калектывізацыі ствараюцца пры забесьпячэньні сельскае гаспадаркі складанымі машынамі, мінэральнымі ўгнаеньнямі і г. д.

4. І, нарэшце, пры наяўнасьці ў нас шпаркага тэмпу калектывізацыі і будаўніцтва саўгасаў, пры наяўнасьці інтэнсыфікацыі сельскае і лясное гаспадаркі, пытаньне навукова-дасьледчых работ у сельскай і лясной гаспадарцы павінна атрымаць найбольш цесную ўвязку навукі з вытворчасьцю ў раённым разрэзе. Праўда, пытаньне аб'яднаньня навукова-дасьледчай працы арганізацыйна вырашана шляхам арганізацыі Ўсесаюзнай Акадэміі сельскае гаспадаркі, але калі не ўвязаць разгортваньне яе работ ужо адразу з вытворчымі заданьнямі паасобных раёнаў, мы ня зможам атрымаць таго эфэкту, які кладзецца партыяй і ўладай у задачы яе арганізацыі.

Усе гэтыя акалічнасьці прыводзяць мяне да вываду, што наша прамысловасьць, якая пашыраецца і вырабляе сродкі вытворчасьці для сельскае гаспадаркі, таксама павінна быць цясьнейшым чынам увязана ў раённым разрэзе. Калгаснае і саўгаснае будаўніцтва, якое пашыраецца, павінна задаволіць патрэбы краіны ў сыравіне і харчаваньні ў залежнасьці ад напрамку гаспадаркі данага раёну. Сельская гаспадарка ўцалку павінна атрымаць найбольшую ўвязку з адзінага кіруючага цэнтру Саюзу ў такой-жа ступені, як гэтую ўвязку атрымлівае прамысловасьць, гандаль і фінансы, а гэта будзе магчыма пры арганізацыі Ўсесаюзнага Камісарыяту сельскае і лясное гаспадаркі.

Вось таму я далучаюся да тых, хто на сьнежаньскай сэсіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу высунуў ідэю аб рацыяналізацыі форм усесаюзнага кіраўніцтва сельскай гаспадаркай.

Якія задачы трэба пакласьці ў аснову арганізацыі Ўсесаюзнага Камісарыяту Земляробства.

Першае—ён павінен быць аб'яднаным камісарыятам па прыкладу ВСНГ, другое—ён павінен зьмясьціць у сабе асноўныя задачы, пастаўленыя партыяй перад сельскай гаспадаркай, а менавіта: распрацоўку і прадстаўленьне ў дырэктыўныя і заканадаўчыя органы мер, спрыяючых найбольш шпаркай рэарганізацыі індывідуальнай гаспадаркі ў буйную сацыялістычную гаспадарку. Трэба, каб будучы камісарыят узяў на сябе найменшую колькасьць пытаньняў, але такіх, якія былі-б кіруючымі для данага раёну, каб у выніку магчыма было-б дабіцца найбольшага эфэкту.

У прыватнасьці я хацеў бы зазначыць, што да будучага камісарыяту павінны адыйсьці функцыі па распрацоўцы асноўных пачаткаў зямельнага, воднага і лясного заканадаўства, распрацоўка на падставе матар'ялаў рэспублік асноўных арганізацыйных і тэхнічных праблем у галіне сельскае і лясное гаспадаркі. Гэта, зразумела, не павінна яго абмежаваць распрацоўкай такіх пытаньняў па сваім ласным пачыне, як кіраўніцтва перасяленьнем і калёнізацыяй у Саюзе.

Нарэшце неабходна дадаць яшчэ непасрэднае кіраўніцтва саюзнымі арганізацыямі—зернатрэстам, машынатрактарным цэнтрам, акцыянэрным таварыствам машыназабесьпячэньня індустрыялізацыі і электрычфікацыі сельскае гаспадаркі і іншыя мерапрыемствы. З арганізацыяй Усесаюзнага Камісарыяту Земляробства павінны быць ліквідаваны або перайсьці да яго такія органы, як перасяленцкі камітэт, хлопкавы камітэт, вэтэрынарны камітэт, водна-мэліярацыйны камітэт Дзяржпляну Саюзу, Нарада наркомаў земляробства саюзных рэспублік як стала дзэйнічаючы орган.

Камісарыят Земляробства павінен быць арганізаваны безадкладна і ва ўсякім разе не пазьней 1 кастрычніка. Будучы орган павінен атрымаць шырэкую папулярызацыю сярод усяе рабочае клясы і працоўнага сялянства і пры яго падтрыманьні і пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі ён павінен будзе найбольш рашуча ўзяцца за ажыцьцяўленьне адзінай лініі ўсяе партыі па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае і лясное гаспадаркі.

МАСЮКОЎ.

На шляху рэарганізацыі Віцебшчыны

За карэнную рэформу статыстычнай работы

Арганізаваць плянава-статыстычнае бюро

(У парадку прапановы)

Рэарганізацыя Віцебскай акругі ў вопытна-паказальную і зьвязанае з гэтым ліквідацыя раду аддзелаў акрвыканкому значна ўзмацняе раённыя цэнтры як палітычныя, эканамічныя і адміністрацыйныя адзінкі.

Рад функцый акруговых аддзелаў перадаецца РВК, справы і аб'ём работы апошніх значна пашыраюцца.

Вялікае месца ў рабоце РВК павінна заняць і плянаваньне, якім РВК раней не займаліся, таму што ня мелі базы для складаньня плянаў апрацаваных статыстычных матар'ялаў.

Зразумела, што паўстае пытаньне—у тэрміновым парадку заняцца рэарганізацыяй статыстычнай справаздачнасьці, каб яна здавальняла патрэбы раёну.

Да гэтага часу наша статыстыка дрэнна здавальняе патрэбы мясцовых органаў. Статыстычны матар'ял дастаўляецца з такім спазьненьнем, што скарыстаць яго ніяк нельга.

Рэарганізацыя акругі і ўмацаваньне раёнаў прымушаюць нас рашуча паставіць пытаньне аб **карэннай рэформе статыстычнай работы**, тым больш што ўся статыстычная справаздача аддзелаў РВК павінна перайсьці да статыстычных органаў, якія зьвязаны асноўнымі пастаўшчыкамі статыстычных матар'ялаў для плянаваньня. Раённы статыстык будзе адзіным зьвяном апарату РВК, праз які будзе накіроўвацца ў акругу ўся статыстычная справаздача.

На пасяджэньні падкамісіі па плянаваньні можна было пачуць прапанову аб тым, што акрстатбюро павінна стаць дадаткам акрпляну. Сапраўды да гэтага часу, статорганы ў многіх мясцох зьяўляюцца дадаткам да мясцовых устаноў. Гэта прывяло да таго, што статыстыка знаходзіцца ў загоне, аплата статыстычных работнікаў самая нізкая, кваліфікаваныя працаўнікі ўцякаюць з статыстычных аддзелаў? Трэба рашуча адкінуць думкі аб дадатках. Не дадатак, а цесная ўвязка работы статыстыкі з плянуючымі органамі, не адрыў ад жыцьця, а максымальнае набліжэньне статыстыкі да сучаснасьці. Статорганы павінны ня толькі зьбіраць весткі, але аналізаваць і сынтэзаваць іх. Так трэба ставіць пытаньне.

Трэба аб'яднаць акрстатбюро і акрплян у адзінае плянавае статыстычнае бюро, гэта аб'яднаньне арганічна зьвяжа работу статыстыкі з работай плянавых органаў.

Плянава-статыстычнае бюро павінна мець рад сэкцый па важнейшых пытаньнях гаспадаркі і культуры На чале сэкцый павінны стаяць, акрамя статыстычных працаўнікоў, некалькіх плянавых работнікаў. Старшыня акрпляну павінен мець двух намесьнікаў—аднаго кіраўніка статыстычнымі работамі, другога—па плянавай рабоце.

Трэба ўзмацніць аб'яднанае бюро кваліфікаванымі працаўнікамі—навуковымі спэцыялістымі з вышэйшай статыстычнай і эканамічнай асьветай, марксысцкі падрыхтаванымі, павялічыць іх пэнсію.

Павінны быць асігнаваны спэцыяльныя сродкі на выдавецкую работу па статыстыцы і плянаваньні.

У раёнах статыстыка павінна быць цесна зьвязана з усёй работай РВК. Райстатыстык павінен зьяўляцца адным з асноўных працаўнікоў РВК і ўваходзіць у яго прэзыдыум. Для гэтага трэба зьвярнуць максымальную ўвагу на падбор райстатыстыкаў. Зразумела, стаўка ў 40 р. ня можа стымуляваць належнага падбору статыстыкаў. Пэнсію ім прыдзецца павялічыць.

У вялікіх раёнах з насельніцтвам звыш 50 тысяч трэба мець раённага статыстыка з 2 памочнікамі, у іншых—па 1 памочніку.

Ажыцьцяўленьне гэтых мерапрыемстваў дасьць магчымасьць наладзіць статыстычную і плянавую работу, якая зараз, у сувязі з выкананьнем 5-цігодкі, адыгрывае асабліва важную ролю.

Е. ЭПШТЭЙН.

Дэцэнтралізацыя фінансавага апарату

(Ад нашага віцебскага карэспандэнта)

Зараз ужо распрацаваны плян рэарганізацыі фінансава-падатковага апарату. Тут намячаецца карэнная ломка. Прынцып рэарганізацыі — **прадстаўленьне большых правоў мясцовым апарату, скарачэньне ліку нотанцый,** застаўленьне за акругай інспэктарска-плянавых функцый.

Фінчасткі ў раёнах і фінансавая інспэкцыя ў Віцебску вызначаюцца выканаваньнем закладаў падатку. Ім-жа перадаецца спагнаньне падаткаў.

Вучастковыя камісіі займуцца толькі разглядам скаргаў на абкладаньне і зьявіцца першай інстанцыяй, наступная інстанцыя, дзе скаргі будуць разглядацца ў парадку нагляду, фінінспэкцыя пры АВК.

На сельска-гаспадарчым падатку першай інстанцыяй для скаргаў будзе сельсавет, другой—райвыканком і трэцяй, зноў у парадку нагляду, інспэкцыя пры АВК.

Мяркуецца значна павялічыць колькасьць сельскіх оюджэтаў. В акруговага бюджэту пераходзіць у раённыя—выдаткі на будаўніцтва новых школ, больніц, аграпунктаў, утрыманьне с.-г. школ і г. д.

Выдатковая частка раённых бюджэтаў значна павялічыцца за лік адпаведнага скарачэньня выдаткаў па акруговым бюджэце. Разам з тым павялічыцца і бюджэт Віцебскага гарсавету.

Б.

З падрыхтоўкай да сяўбы на мясцох не сьпяшаюцца

РАШУЧА УДАРЫМ ПА НЯДБАЙНАСЬЦІ І ВАЛАКІЦЕ. МАБІЛІЗУЕМ УСЕ СІЛЫ НА ПРАВЯДЗЕНЬНЕ АСЕНЬНЯЙ С.-Г. КАМПАНІІ

КЛЯСАВЫЯ ЗАДАЧЫ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ

Усякае колькі-небудзь сур'ёзнае мерапрыемства, зьвязанае з сацыялістычнай рэканструкцыяй сельскай гаспадаркі, сустракае шалёнае супраціўленьне кулацкіх элемэнтаў. Змагаючыся з кулаком, бядняцкія і серадняцкія масы становяцца на шлях рэвалюцыйнае перабудовы сваёй дробнай адсталай гаспадаркі, а кожны крок на гэтым шляху няўхільна выклікае далейшую барацьбу, абвастрэньне барацьбы.

У падрыхтоўцы азімай кампаніі трэба дакладна ўлічыць усю злучнасьць гаспадарчых клясавых умоў, якія характарызуюць сучасны этап разьвіцьця савецкае вёскі. Мерапрыемствы падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы, пры правільным іх правядзеньні, павінны даць у выніку ўмацаваньне саюзу рабочае клясы з серадняком, умацаваньне бядняцка-серадняцкага блёку супроць кулака.

Апіраючыся на зацікаўленасьць серадняка ў мерапрыемствах, што праводзяцца, апіраючыся на стымулюючы ўплыў нашай палітыкі цэн і ільгот па падатку, мы павінны дабіцца ў ходзе кампаніі ўзмацненьня тэмпу ўцягненьня серадняцкіх мас у сацыялістычнае будаўніцтва. У тэй-жа час трэба сачыць за тым, каб мерапрыемствы, накіраваныя супроць кулака, не забівалі серадняцкую масу вёскі, каб у палітыцы ў адносінах да серадняка, не паўтараліся выпадкі перагібаў, што намячаліся ў папярэдніх кампаніях.

Пры правядзеньні ўсіх паказаных мерапрыемстваў, асабліва па аказаньні дапамогі беднаце, трэба самым бязьлітасным чынам змагацца з кулацкім супраціўленьнем яківідаваць у самы кароткі тэрмін выпадкі бюракратызму.

Падрыхтоўка да асеньняй сяўбы толькі ў тым выпадку пройдзе пасьпяхова, калі мы моцна ўдарым па недахватах, дапаможам нізавым арганізацыям у ходзе работы выпраўляць недахопы, выпраўляць клясавую лінію. Тут асабліва важна выразнае партыйнае кіраўніцтва. Мясцовыя партыйныя арганізацыі павінны непаслабна сачыць за разгортваньнем кампаніі, трымаць цесную сувязь з савецкімі органамі, каапэрацыі і іншымі грамадзкімі арганізацыямі на вёсцы. У азімай пасеўнай кампаніі, якая прадстаўляе важнейшы вытворчы момант жыцьця вёскі, патрэбна мабілізацыя грамадзкіх сіл вакол партыйнага кіраўніцтва. Прафсаюзы і арганізацыі павінны быць апорай партыйных арганізацый пры правядзеньні мерапрыемстваў клясавага значэньня. Трэба цьвёрда запомніць, усьвядоміць і зразумець, што выкананьня плянаў і нават перавышэньня плянаў далейшага пашырэньня пасеўных плошчаў мы дасягнем толькі ў тым выпадку, калі здолеем правільна злучыць на практыцы вытворчыя задачы з клясавай палітыкай.

(«ПРАВДА»).

На рэйкі сацыялістычнага спаборніцтва

Надыходзіць асеньняя сяўба. У гэту восень патрэбна асабліва напружанасьць пры падрыхтоўцы да сяўбы, бо ўсе мерапрыемствы неабходна правесьці ў значна карацейшы тэрмін, чым у веснавую кампанію.

Задачы, пастаўленыя перад асеньняй пасеўнай кампаніяй, мы выканаем добра толькі тады, калі ў часе падрыхтоўкі да сяўбы прыцягнем усё насельніцтва да справы перабудовы сваіх гаспадарак.

Сацыялістычнае спаборніцтва на лепшае правядзеньне асеньняй сяўбы павінна быць разгорнута ўсімі вёскамі, пасёлкамі і г. д. Калгасы павінны быць пачынальнікамі ў гэтай справе.

Трэба сказаць, што шырокае разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва паміж палямі можа быць праведзена толькі тады, калі ўсе партыйныя ячэйкі, усе савецкія і грамадзкія арганізацыі дапамогуць сялянству ў гэтай справе, растлумачаць яму значэньне спаборніцтва, добра арганізуюць бядняцка-серадняцкую частку насельніцтва на змаганьне за перабудову сваіх гаспадарак.

Як-жа ідзе справа разгортваньня спаборніцтва на мясцох? Як уцямілі сябе ролю ўцягненьня мас у справу перабудовы вёскі нашы нізавыя кіруючыя арганізацыі?

Трэба адзначыць, што ў шмат якіх мясцох спаборніцтва праходзіць вельмі марудна. Парт'ячэйкі, а за імі сельсаветы і іншыя арганізацыі і ўстановы не абмяркоўваюць практычна пытаньня аб уцягненьні мас у справу перабудовы вёскі шляхам спаборніцтва. Напрыклад, у Нараўлянскім раёне, Мазырскай акругі сацыялістычнае спаборніцтва пачало разгортвацца толькі аднэй партыйнай ячэйкай—Нараўлянскай местачковай. Усе іншыя ячэйкі сьпяць і да гэтага часу.

Пачатак, зроблены Нараўлянскай партыйнай ячэйкай, павінен даць добрыя вынікі. На пасяджэньні бюро, а потым і на сходзе ячэйкі было добра распрацавана пытаньне аб спаборніцтве, пасьля чаго былі накіраваны ў вёску асобныя таварышы для растлумачальнай работы сярод сялянства. У выніку вёскі Вербавічы і Вуглакі добра зразумелі ўсю важнасьць гэтага пытаньня і выклікалі на лепшае правядзеньне асеньняй пасеўкампаніі вёску Барбараў. Апошняя на агульным сходзе прыняла выклік; спаборніцтва пачалося паміж некалькімі сельсаветамі.

Не абыйшлося і без адмоўных момантаў. У вёсцы Вербавічах старшыня Вербавіцкага сельсавета Шоран,—кандыдат КП(б)Б,—на сходзе аграўпаўнаважаных, які практычна абмяркоўваў правядзеньне ў жыцьцё ўсіх пунктаў сацыялістычнага дагавору з вёскай Барбароў,—выступіў супроць сацыялістычнага спаборніцтва і заявіў, што «усё гэта глупства, мы ня зможам гэта правесьці». **Але сход аграўпаўнаважаных даў належны адпор гэтаму «партыйцу».**

У часе пашыранага пленуму РВК быў падпісаны дагавор паміж гэтымі трыма вёскамі. Ад імя ўсіх вёсак на пленуме РВК выступіў селянін Ільля Мэлях, **які запэўніў пленум, што справа перабудовы вёскі знайшла шырокі водгук сярод сялянства.**

Пасьля гэтага Нараўлянская ячэйка КП(б)Б паставіла пытаньне аб спаборніцтве і паміж пасёлкамі. Пас. «Чырвоная Кветка» выклікаў чатыры пасёлкі Нараўлянскага раёну—«Чырвоную Бярэзіну», «Чырвоную Пчолку», «Чырвоную Горку», «Раманаўку». Пасёлкаўцы абавязваюцца правесьці 100 проц. ачыстку насельня, здабыць 4 тоны торфу на двор (раней яго не здабывалі), пазяблець поле і агароды, разгарнуць работу машынага т-ва, ацяпліць і асьвятліць усе хлявы, пабудаваць дацкія кармушкі ў 50 проц. гаспадарак, раскарчаваць на 0,5 дзесяціны сенажаці і рад іншых пунктаў.

Добрае правядзеньне ў жыцьцё дагавору па спаборніцтве на вёсцы значна залежыць ад добрага падбору аграўпаўнаважаных, якія павінны наглядаць за правядзеньнем усіх мерапрыемстваў на іх вёсках. На работу з аграўпаўнаважанымі павінна быць зьвернута асаблівая ўвага, а таксама і падбор іх павінен адказваць задачам, пастаўленым перад імі. Часу на падрыхтоўку да сяўбы засталося вельмі мала. Усе, хто не пачаў думаць аб уцягненьні мас у правядзеньне пасеўкампаніі, зараз-жа павінны разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва паміж палямі і тым самым забясьпечыць лепшае правядзеньне ўсіх мерапрыемстваў па перабудове нашай сельскай гаспадаркі.

М. АЛМАЗАЎ.

Аграномы ў адпачынку...

(Ад наш. гомельскага карэспандэнта)

Яшчэ і яшчэ раз прыходзіцца біць трывогу на поваду падрыхтоўкі да асеньняе сяўбы.

З месц зноў паступаюць трывожныя весткі. Вось асобныя факты. У Хойніцкім раёне не разьмеркаваны мінэральныя ўгнаеньні толькі таму, што аграном-каапэратар знаходзіцца ў адпачынку. У Ўраравіцкім раёне знаходзяцца ў адпачынку ўсе зямельныя работнікі і частка аграномаў; рэшткі аграномічнага пэрсаналу ідзе ў водпуск з 15-га жніўня.

Растлумачальная работа сярод насельніцтва не праведзена так, як гэта трэба было чакаць. Многія сельсаветы ня склалі яшчэ нават сваіх плянаў.

Наглядаюцца асобныя выпадкі нядбайнасьці ў рабоце аграномічнага пэрсаналу. Так, напрыклад, аграном - каапэратар Уравіцкага раёну склікаў у вёсцы Сталіна пленум сельсавету наконт пасеўнай кампаніі, і, калі ўсе члены савету сабраліся, сам аграном на пасяджэньне не зьявіўся.

Няма выстарчальнай выразнасьці ў правядзеньні выкліку зборжа. Ня ўсе збожжаачышчальныя машыны, што ёсьць у калгасах, саўгасах і машынных таварыствах, улічаны поўнасьцю і ня ўсе яны маюць поўную нагрузку. Загадчык саўгасу Брылева — Мінін, ня гледзячы на паўторнае напамінаньне райвыканкому, да гэтага часу не адрамантаваў збожжаачышчальныя машыны, што ёсьць у саўгасе (справа аб ім перадана пракурору).

Дрэнна абстаіць справа з арганізацыяй абозаў па абмалоце збожжа ў раёнах. Ад свачасовае малацьбы залежыць свачасовасьць пасеву азімых, а між тым, інвэнтар, што ёсьць у саўгасах, калгасах і машынных таварыствах, не мабілізаваны для гэтай тэрміновай работы па абмалоце збожжа гаспадарак беднаты.

Два-тры тыдні, што засталіся да пачатку сяўбы, павінны быць скарыстаны з максымальнай напружанасьцю ўсіх сіл і сродкаў. Вінаватыя ў злачына-нядбайных адносінах да асеньняй пасеўнай кампаніі павінны быць сурова пакараны. Увага ўсёй пралетарска - савецкай грамадзкасьці павінна быць згрупавана на пытаньнях асеньняе сяўбы. Дырэктыва партыі аб асеньня-пасеўнай кампаніі павінна быць выкананa.

Угнаеньне яшчэ не завезена

Па Аршанскай акрузе ўжо разгарнулася падрыхтоўчая работа да асеньняй сяўбы. Праверены зернаачышчальныя машыны і адрамантаваны палсаваныя, складзены каляндарныя пляны руху абозаў зернаачышчальных машын, праведзены куставыя сходы аграўпаўнаважаных, на якіх абгаварваліся пытаньні асеньняй сяўбы і, асабліва, зернаачышчэньня. Працаўнікі акругі выяжджаюць у раёны для праверкі, як там вядзецца падрыхтоўка да сяўбы.

У гэтым годзе на ўсёй акрузе мяркуецца ачысьціць 62 проц. усяго пасеўнага матар'ялу. Да правядзеньня зернаачышчэньня прыцягваюцца камсамольскія арганізацыі, прафсаюзы і ўсе вясковыя грамадзкія арганізацыі. У часе зернаачышчэньня будуць скарыстаны машыны калгасаў, саўгасаў, с.-г. крэдытных таварыстваў, машынных таварыстваў і камітэтаў узаемадапамогі.

Паміж калгасамі, а таксама і паміж саўгасамі разгорнецца спаборніцтва на лепшае абслугоўваньне сялянства ў часе сяўбы. Дрэнна абстаіць справа з угнаеньнямі. Іх трэба завезьці ў акругу 5000 тон розных сартоў, але дагэтуль яшчэ нічога не завезьлі і толькі вызначылі 110 вагонаў. Гэтай колькасьці, зразумела, будзе мала. А сярод сялян ужо ёсьць зараз вялікі попыт на мінэральныя ўгнаеньні.

Адбылася парада раённых аграномаў, якая падкрэсьліла неабходнасьць абавязковага завозу мінэральных угнаеньняў, бо бяз іх немагчыма што-небудзь рабіць і у адносінах навышэньня ўраджайнасьці.

У часе асеньняй сяўбы на палёх Аршанчыны разгорнецца сацыялістычнае спаборніцтва. Кожны раён, кожны сельсавет і кожная вёска ўжо да гэтага рыхтуюцца.

Падрыхтоўчая работа пры ўмовах завозу ў акругу ўсяго патрэбнага гаворыць за тое, што асеньняя сяўба будзе праведзена добра, пляны будуць выкананы.

А. МІЛАШЭЎСКІ.

Агульна-гарадзкая нарада рабкораў

Масавы аддзел рэдакцыі «ЗВЯЗДЫ» склікае на чацьвер, 15-га жніўня, а 7-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні рэдакцыі (Савецкая, 63)

АГУЛЬНА-ГАРАДЗКУЮ НАРАДУ РАБКОРАЎ І ЧЛЕНАЎ РЭДКАЛЕГІЙ НАСЬЦЕНГАЗЭТ

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Аб чыстцы парт'ячэек савецкіх устаноў і задачы рабкораў і насьцэнгазэт.
2. Бягучыя справы.

З прычыны важнасьці гэтых пытаньняў просьба да ўсіх рабкораў і членаў рэдкалегій зьявіцца без спазьненьня.

Масавы аддзел.

Жывое кіраўніцтва падменьваюць абежнікамі

Пастановы партыі аб уздыме сельскай гаспадаркі на грунце рэканструкцыі і калектывізацыі яе знаходзяць шырокае падтрыманьне з боку бядняцка-серадняцкіх мас сялянства. Гэта яскрава выявілася ў часе правядзеньня веснавой пасеўкампаніі. Надыходзячая асеньняя пасеўкампанія павінна ў значнай меры пашырыць работу па канкрэтным выкананьні гэтых пастаноў.

На вялікі жаль асобныя працаўнікі дагэтуль яшчэ не ўсьвядомілі сабе важнага значэньня партыйных дырэктыў аб асеньняй сяўбе. Яскравым прыкладам гэтага зьяўляецца Чэрыкаўскі РВК. Уся яго падрыхтоўка да асеньняй сяўбы заключаецца толькі ў распрацоўцы пляну. Паміма пляну ніякай падрыхтоўчай масавай працы да асеньняй пасеўкампаніі не праведзена, нават у асобных паселішчах сялянства не азнаёмлена з ільготамі, якія даюцца па водле новага закону аб сельгаспадарчым падатку. Да рэчы адзначыць, што ў асеньнюю пасеўкампанію замест намечаных паводле пляну 13 калгасаў у гэтым раёне было арганізавана толькі 3 калгасы.

Пашырэньне пасеўнага кліну паводле пляну прадугледжваецца на палову проц., што не адпавядае дырэктыве партыі. Пры ўстанаўленьні лічбаў па асобных культурах да лічбаў мінулага году мэханічна дабаўлялася некалькі гектараў (ад 2 да 8 гакт. на сельсавет) бяз усякага сталага вучоту гаспадарчых магчымасьцяй таго альбо іншага сельсавету.

Адным з вялікіх мерапрыемстваў па падняцьці ўраджайнасьці с.-гаспадаркі зьяўляецца праца па вапнаваньні глебы. На гэтую справу ўлада адпускае многа сродкаў, якія павінны даць належны гаспадарчы эфэкт. У Чэрыкаўскім раёне прадугледжана пабудова вапельнага заводу. Тры з паловай месяцы таму назад адпушчаны грошы (7000 р.) на пабудову гэтага заводу, дастаўлен паравік. Акруга ў поўнай упэўненасьці, што ў асеньнюю пасеўкампанію будзе праводзіцца вапнаваньне глебы.

Але надзеі і засталіся толькі надзеямі. Атрымаўшы грошы, Чэрыкаўскі РВК доўга спрачаўся, каму даручыць пабудову заводу—КСУ альбо крэдытнаму т-ву. Нарэшце даручылі апошнему. А пасьля гэтага займаюцца складаньнем камісіі для вывучэньня месца для пабудовы заводу. І вось да гэтага часу ўсё займаюцца спрэчкамі і вывучэньнем, а грошы т-ва выкарыстоўваюць на іншыя мэты.

Сацыялістычнае спаборніцтва зьяўляецца чымсьці далёкім для працаўнікоў Чэрыкаўскага РВК. З усяго гэтага можна зрабіць толькі адзін вывад: асеньняя пасеўкампанія ў Чэрыкаўскім раёне пад пагрозай зрыву.

Раённай партыйнай арганізацыі неабходна зараз-жа выкарыстаць кароткі тэрмін, які застаўся да пачатку сяўбы, рашуча ўдарыць па нядбайна-бюракратычных адносінах некаторых працаўнікоў РВК да такой валікай і паважнай працы і праводзіць яе на грунце сацыялістычнага спаборніцтва з шырокім прыцягненьнем батрацкіх, бядняцка-серадняцкіх мас насельніцтва. Гэта зьявіцца гарантыяй пасьпяховага выкананьня дырэктыў партыі.

АЛ. ДОЎГІ.

АБ РЭАРГАНІЗАЦЫІ СЫСТЭМЫ СЕЛЬГАСКААПЭРАЦЫІ БССР

(У парадку абгаварэньня)

Па даручэньні ЦК КП(б)Б ужо больш месяцу працуе спэцыяльная ўрадавая камісія над пытаньнем рэарганізацыі сыстэмы с.-г. каапэрацыі БССР. Аб мэтадах работы гэтай камісіі і аб некаторых спрэчных пытаньнях, высунутых гав. Дубіной (гл. «Зьвязда» № 178 ад 7/VIII), я і хачу спыніцца ў гэтым артыкуле.

ГАБІНЭТНЫЯ ПЛЯНЫ

Перш за ўсё аб мэтадах работы самой камісіі. Камісія працуе замкнута, габінэтна, бяз уліку думак работнікаў месц **і нават да апошніх дзён ня была зьвязана з НК РСІ.** А між тым на пасяджэньнях камісіі і нарадах узьнікае шмат спрэчных прынцыповых пытаньняў, якія застаюцца ў габінэтах нявырашанымі. Я думаю, што ўсе гэтыя спрэчныя прынцыповыя пытаньні павінны быць асьветлены ў нашым друку, па іх павінен выказацца і цэлы рад работнікаў месц, гэта ў значнай ступені палегчыла-б работу камісіі ў такім надвычайна адказным і цяжкім пытаньні і папярэдзіла-б ад магчымых памылак. Той жа праект пастановы ўраду, які зараз рыхтуецца, **павінен быць перададены на папярэдняе абгаварэньне ў нізавыя арганізацыі.** Абмеркаваньне яго павінна прайсьці з пункту погляду сельска-гаспадарчага раёнаваньня БССР, мабілізацыі грамадзкае думкі бядняцка-серадняцкіх мас вакол задач рэарганізацыі сыстэмы с.-г. каапэрацыі.

Ня маючы магчымасьці падрабязна гаварыць аб практычным правядзеньні рэарганізацыі ўсёй сыстэмы сельска-гаспадарчай каапэрацыі, я спынюся толькі на артыкуле т. Дубіны, апублікаваным у газэце «Зьвязда» за № 178 ад 7-га гэтага жніўня. Бязумоўна, яго артыкул мае цэлы рад станоўчых бакоў, якія растлумачваюць пастанову ЦК УсеКП(б), а таксама як практычна гэтыя пастановы ўжываць ва ўмовах БССР. Але артыкул таксама, як мне здаецца, мае і рад спрэчных пытаньняў, з якімі згадзіцца нельга, на некаторыя-ж пытаньні артыкул не дае простага адказу.

АБ РАЗЬМЕРАХ ПАСЯЛКОВАГА ТАВАРЫСТВА

Тав. Дубіна ў сваім артыкуле піша: «...а таксама прымаючы пад увагу агульную ўстаноўку ЦК УсеКП(б)—аб стаўды на раён і перасоўны апэрацыйна-гаспадарчых і крэдытных функцый, а зразумела і сіл у раёны...». Усё гэта, зразумела, важна і патрэбна, але т. Дубіна ня досьць правільна зразумеў пастанову ЦК УсеКП(б), гаворачы аб «стаўды на раён». **Асноўнае, вузлавое, цэнтральнае пытаньне рэарганізацыі сыстэмы с.-г. каапэрацыі, ёсьць пытаньне пабудаваньня нізавога вытворчага таварыства пасяловага тыпу, на аснове спэцыялізацыі па галоўных галінах с.-г. вытворчасьці.** Вось на што бярэцца ўпор, т. Дубіна. Першапачатковае вытворчае таварыства—цэнтр увагі, яно павінна сваёй работай і арганізацыяй хутка перарастаць у буйны калгас.

Далей, аб разьмерах пасяловага таварыства. Тав. Дубіна піша: «калі па ўмовах тапаграфіі (рэльеф, глеба і г. д.) магчыма будзе ахапіць будучым калгасам 2-3 тыс. гэкт. зямельнай плошчы, то статутны разьмер пасяловага таварыства таксама павінен быць у 2-3 тыс. гэкт., калі-ж па ўмовах мясцовасьці, алтымальны разьмер плошчы для буйное гаспадаркі бярэцца 500-1000 гэкт., то і пасяловае таварыства трэба браць у такім-жа разьмеры. Такім чынам у пасяловае таварыства павінны ўваходзіць адна-дзьве буйныя вёскі або група вакольных вёсак і пасёлкаў. Ва ўсіх магчымых выпадках трэба браць найбольш вялікую тэрыторыю з улікам у далейшым арганізацыі на гэтай тэрыторыі буйнага машынізаванага калгасу».

Да гэтага, бясспрэчна, у сваёй практычнай рабоце мы ўсямерна павінны імкнуцца. Але думаю, што наўрад ці мэтазгодна на першы час у пэрыяд рэарганізацыі нашай нізоўкі, ставіць сабе задачу аб'яднаньня адразу ў адно пасяловае таварыства па некалькі буйных вёсак. Ці не зьпалохаем мы гэтым бядняцка-серадняцкае сялянства? Тут трэба лічыцца ня толькі з рэльефам і глебаю мясцовасьці, але і прыняць пад увагу пэўную інэртнасьць, якую мы на першы час можам спаткаць з боку асноўнай масы сялянства. Мне здавалася-б, што вызначаць аптымальнасьць пасяловага таварыства ў 3-5 тыс. гэкт. зараз ня трэба, **а трэба ўстанавіць прыкладны мінімум, выходзячы з разьліку цяперашняга сярэдняга разьмеру калгасу,** забясьпечыць такое пасяловае таварыства цьвёрдым пецякучым складам яго членаў і потым **узмоцнена разьвіваць работу па пагалоўным каапэраваньні бядняцка-серадняцкіх мас як данай вёскі, так і аб'яднаньня ўжо некалькіх блізкіх вёсак, з разьлікам арганізацыі аднаго буйнага калгасу з іх.**

НЕДААЦЭНКА ВАЖНАСЬЦІ ІЛЬНАВОДНЫХ І НАСЕННАВОДНЫХ Т-ВАЎ

На запытаньне аб тым, колькі і якіх вытворчых таварыстваў павінна быць на вёсцы,—тав. Дубіна рашуча ў сваім артыкуле адказвае: «як правіла на вёсцы павінна быць адно пасяловае таварыства пераважнай

У Савеце Народных Камісараў

Насустарч запатрабаваньням піянэраў

Савет Народных Камісараў зацьвердзіў праект пастановы, якая ставіць сваёй мэтай палепшыць працу сярод дзяцей.

ВСНГ і Наркамасьветы даручана арганізаваць у 1930 годзе ў Менску цэнтральную піянэрскую тэхнічную станцыю, якую ВСНГ павінен забясьпечыць тэхнічнымі сіламі і абсталяваньнем.

Наркамасьветы і Наркамзему даручаецца арганізаваць у 1930 годзе пры Горацкай сельска-гаспадарчай акадэміі цэнтральную піянэрскую с.-г. станцыю.

Наркамасьветы павінен не пазьней і верасьня падаць у СНК праект агранамізацыі школ і дзіцячых дамоў, якія знаходзяцца ў сельскіх мясцовасьцях. НК Земляробства павінен дапамагаць піянэрскім атрадам у іх сельска-гаспадарчай рабоце і забясьпечваць іх на ільготных умовах насеньнем і штучным угнаеньнем для работ на школьных вучастках.

Акруговыя выканаўчыя камітэты павінны вылучыць фонды для забесьпячэньня дзяцей беднаты інтэрнатамі і стыпэндыямі. **Вышэйшаму** Савету Фізычнай Культуры даручана арганізаваць у 1930 годзе ва ўсіх акруговых цэнтрах курсы для фізкультурнай падрыхтоўкі правадыроў атрадаў юных піянэраў.

Індустрыялізацыя саўгасаў

СНК прыняў пастанову, якая прадугледжвае рад мер па ўзмацненьні індустрыялізацыі савецкіх гаспадарак БССР.

Зямельным органам катэгарычна забаронена абрэзваць зямельную плошчу саўгасаў і неадкладна прыступіць да іх узбуйненьня.

Арганізацыі і паасобныя сялянскія гаспадаркі, якія дастаўляюць у саўгасы на перапрацоўку малочныя прадукты, павінны забясьпечваць моцнымі кармамі, на аднальковых умовах з насельніцтвам, якое здае малако ў каапэрацыю.

З 1929 году пры саўгасах арганізуецца не менш 10 трактарных калён, якія павінны абслугоўваць акрамя саўгасаў, калектыўныя і сялянскія гаспадаркі.

СНК пастанавіў закупіць для саўгасаў да 1932 году 1000 галоў маладняку, перайсьці да арганізацыі ў саўгасах буйных малочных фэрм з утрыманьнем у гаспадарцы да тысячы дойных кароў.

Плошча прыгарадных саўгасаў, што знаходзіцца пад гародніной, павінна быць даведзена да 1000 гектараў.

Пры саўгасах трэба арганізаваць рад прадпрыемстваў па апрацоўцы с.-г. сыравіны.

Страхаваньне работнікаў лясьніцтваў

СНК пастанавіў увесьці ў пачатку новага бюджэтнага году абавязковае дзяржаўнае страхаваньне лясьнікоў і абсчэтчыкаў на выпадак забойства ці параненьня іх, пры выкананьні службовых абавязкаў.

Акрамя таго будуць выдавацца грашовыя дапамогі ўсім лясным работнікам, якія пацярпелі ад падпалу, рабункаў і іншых злачынстваў.

Мільён рублёў на электрафікацыю саўгасаў

Калдэпартамент заключыў дагавор з Электрасельбудам на пабудову ў саўгасах Завалочыцы, Ціханічы, Канстанцінаўка, Бабруйскай акругі, і Лапухі, Менскай акругі, 4-х электрастанцый.

Пабудова станцый дасьць магчымасьць шырока ўжываць электрычную энэргію ў сельскай гаспадарцы і асьвятляць вёскі на адлегласьці да 10 клм. Да будаўніцтва будзе прыступлена ўжо ў гэтым годзе.

Ільготы рабочым, якія паступаюць на рабфакі і ВНУ

Наркампрацы паведамляе, што, згодна пастановы СНК СССР ад 8 мая, рабочыя і служачыя, якія намандыруюцца на рабфакі і ў ВНУ, атрымліваюць выхадную дапамогу ў разьмерах месячнага сярэдняга заработку.

У выпадку, калі рабочыя ня прыняты ў рабфак і ў ВНУ, яны маюць права не азьнай, як праз 5 дзён пасьля абвяшчэньня вынікаў прыёму, зьвярнуцца на бліжэйшую пасаду.

Не хапае інтэрнатаў для студэнтаў

Студэнты патрабуюць ажыцьцяўленьня прапановы т. Ларына

Самым сур'ёзным пытаньнем надыходзячага навучальнага году ў БДУ і іншых ВНУ зьяўляецца кватэрнае пытаньне. Няма месца для разьмяшчэньня 180 старых студэнтаў, не гаворачы ўжо аб 700 студэнтаў повага прыёму.

Такое становішча з інтэрнатамі пагражае зрывам заняткаў у першай палове навучальнага году, бо ўсе студэнты будуць заняты адшуканьнем сабе кватэр.

Наркамасьветы і гарсавет ня прымаюць мер да забесьпячэньня нармальнай навучальнай работы і разьмяшчэньня студэнцтва.

Па думцы менскіх студэнцкіх арганізацый, трэба магчыма хутчэй ажыцьцявіць прапанову т. Ларына аб перадачы часткі ўсталёў на работу не дзьве зьмены з тым, каб прадставіць лішкі плошчы пад студэнцкія інтэрнаты.

Студэнцтва лічыць, што ў першую чаргу трэба аб'яднаць у адным памяшканьні Наркамасьветы і Наркамат аховы здароўя з тым, каб будынак Наркамасьветы перадаць пад студэнцкі інтэрнат.

Арганізаваць таварыствы прыхільнікаў кіно

Сілай свайго ўзьдзейнічаньня на розум і пачуцьцё глядачоў, асабліва, культурна адсталых, кіно можа прынесьці шкоды ня менш, чым карысьці, у залежнасьці ад зьместу кіно-карціны. Кіно павінна быць у нашых руках магутным сродкам камуністычнай асьветы і агітацыі.

Але практыка работы Белдзяржкіно гаворыць аб тым, што часта кіно ня выконвае тых задач, якія на яго ўскладзены. Часта кіно-фільмы адлюстроўваюць ідэалёгію чужой нам клясы.

Адной з важнэйшых мер мабілізацыі грамадзкае ўвагі наўкола савецкай кінэматаграфіі зьяўляецца арганізацыя дабраахвотнага таварыства прыхільнікаў савецкага кіно.

Таварыства ставіць сабе задачай:

— Арганізаваць грамадзкасьць наўкола кіно.

Максымальна саздейнічаць вытворчасьці савецкіх фільм.

Вывучыць пытаньні кінэматаграфіі (тэхнічныя, тэарытычныя, навуковыя).

— Садзейнічаць арганізацыі стацыянарных установак і перасовак.

— Праводзіць кампанію за кінофікацыю СССР і «кіно ў вёску».

Змагацца з ідэалёгічна-шкодлывымі фільмамі.

Таварыства стварае групы і гурткі па вывучэньні фатаграфіі на распрацоўцы сцэнарыю, праводзіць дыспуты па кіно-фільмах, арганізоўвае кінэ-фото-выстаўкі, падрыхтоўвае кадр кваліфікаваных кіно-працаўнікоў.

У РСФСР і на Украіне таварыства прыхільнікаў кіно працуе ўжо з 1924-25 году. У асобных губэрніях таварыствы настолькі замацаваліся, што ўжо прыступілі да самастойных здымак кінохронікі (Растоў), культфільм (Варонеж).

Зусім насьпела патрэба арганізаваць гэткае таварыства і ў нас, у БССР.

Дайце пошту акраінам!

Адміністрацыя Менскай п.-т. канторы слаба зварочвае ўвагу на пашырэньне паштова-тэлеграфнай сеткі. Адкрытыя ў Менску некалькі філіялаў ня могуць поўнасьцю вдаволіць патрэб насельніцтва. Радыуо дзейнасьці гэтых філіялаў такі вялікі, што працоўнае насельніцтва акраін Менску атрымлівае пошту неакуратна. Ян на прыклад, можна паказаць на раён Шпітальнай вуліцы, Шпітальных заўулкаў і інш. прылягаючых да іх вуліц. Жыхаром гэтых раёнаў прыходзіцца карыстацца паслугамі ці Цэнтральнай пошты ці на Ленінскай вул., ці філіялам яе на Камароўцы. Адлегласьць у абодвы бакі даволі вялікая.

І не дарма жыхары шпітальнага паштовага раёну і прадстаўнікі вайсковых часьцей узьнялі пытаньне аб адкрыцьці п.-т. агэнцтва. Трэба спадзявацца, што голас іх будзе пачуты адміністрацыяй п.-т. канторы.

А. Г.

На пленуме менскага гарсавету

Каналізацыя—трамвай—упарадкаваньне вуліц

Чарговы пленум гарсавету 12 жніўня быў прысьвечаны пытаньню **аб дабрабыце гор. Менску.**

Загадчык Камгасу тав. **Дзічкоўскі** ў сваім дакладзе азнаёміў членаў гарсавету з работамі па палепшаньні дабрабыту сталіцы.

Закрануўшы пытаньне аб **каналізацыі**, тав. **Дзічкоўскі** заявіў, што сёлета будзе каналізавана 64 дамаўладаньні з 660 кватэрамі па Ленінскай і Савецкай вул. Агульны кошт гэтых работ каля 400 тысяч рублёў. Адпушчаны-ж крэдыт толькі ў суме 75 тысяч руб., што выклікае рад труднасьцяў.

Тав. **Дзічкоўскі** ўсё-ж запэўніе, што ўся праграма каналізацыйных работ будзе выканана і эксплёатацыя каналізацыі пачнецца ў першых чыслах лістапада.

У 1929-30 годзе намечаны выдаткі работы па каналізацыі Менску ў суме 1 мільён 150 тысяч руб. Плянам прадугледжваецца пракладка 110 мэтраў труб па Нямізе, уключэньне ў трубу Суцінскай канавы, абсталяваньне каналізацыі ў 872-х кватэрах і далучэньне клінік да каналізацыйнай сеткі.

Далей тав. **Дзічкоўскі** спыніўся на пытаньні аб **трамвайным будаўніцтве.** Будаўнічай праграмай 1930 г. намячаецца пабудова трамвайнай лініі другой чаргі: пасажырскі вакзал—Серабранка, Камароўка—Ўсебеларуская с.-г. выстаўка. Агульны кошт трамвайных работ будучага году складае 1 мільён 117 тысяч руб.

У гэтым сэзоне будуць забрукаваны Сураскі рынак, Глухая вуліца і вул. Лекерта. Будзе таксама зроблены рамонт мастоў па Камунальнай і Шырокай вул.

Рад значных работ па палепшаньні дабрабыту прадугледжаецца ў 1930 г. Намячаецца водпуск 100 тысяч руб. на пабудову жалеза-бэтоннага маста праз раку Сьнісла ў 3-й вул. Лекерта. Упяршыню будуць праведзены работы па забрукаваньні брушчаткай Ленінскай вул. ад пляцу Волі да Савецкай і ад рогу Савецкай вул. да Сьвярдлоўскай.

Будуць абсталяваны дадатковыя гарадзкія гадзіньнікі ў розных раёнах гораду.

Даклад тав. Дзічкоўскага выклікаў жвавыя спрэчкі.

Тав. **Лобін** адзначыў, што на грамадзкіх работах вельмі многа абслугоўваючага пэрсаналу. Рамонт мастоў праводзіцца дрэнна, асабліва ў раёне Ляхаўкі. Камгас не наглядае за рамонтам дамоў.

Тав. **Зелькінд** гаворыць, што **Камгас павінен больш увагі ўдзяляць дабрабыту акраін гораду.** У гэтай галіне яшчэ вельмі мала зроблена. Па думцы тав. Зелькінда, трамвайныя рэйкі на рагу Савецкай і Ленінскай вул. пракладзены няправільна, бо яны праходзяць амаль ля самага тратуару.

Тав. **Ваўчок** прапануе прыцягнуць да адказнасьці тых, што ліквідавалі вакзальную электрастанцыю. Эльвод павінен быў прадбачыць, што ён ня справіцца з здавальненьнем насельніцтва электра-энэргіяй. Эльвод дабіўся ліквідацыі вакзальнай станцыі, а цяпер ня можа забясьпечыць сьвятлом рабочыя акраіны.

Тав. **Грыцель** ад імя камскладу і лягэру—«Чырвонае Ўрочышча» перадае падзяку Менскаму савету за дапамогу ў пабудове лазьні ў раёне лягэраў. Ён просіць гарсавет дапамагчы праводцы электрычнасьці.

М. К.

«СПОРТ»

Закрылася акруговая сялянская спартакіяда

11 жніўня ўвечары закрылася акруговая спартакіяда вясковых фізкультурнікаў. У спартакіядзе ўдзельнічала 160 чалавек ад 14 раёнаў Меншчыны.

У бегу на 100 мэтр. добрыя вынікі паказаў селянін Дзяруга з Барысаўскага раёну (12,9 хв.), У бегу на 60 мэтраў для жанчын лепшыя вынікі паказала Быхаўская, з Пухавіцкага раёну і Янкоўская, з Бярэзінскага раёну.

У скоках на вышыню пяршынство ўзялі: селянін Раманаў, з Барысаўскага раёну (155 см.) і Янкоўская, з Бярэзінскага раёну (120 см.).

У іграх у вайскова-палявыя гарадкі першае месца заняў Бярэзінскі раён.

На ўсебеларускую спартакіяду абрана 27 делегатаў.

Спартакіяда прайшла вельмі ажыўлена, яна дасьць моцны штуршок разьвіцьцю фізкультуры на вёсцы.

Акруговыя сялянскія спартакіяды

МАГІЛЕЎ, (наш кар.). 12 жніўня адкрылася акруговая сялянская спартакіяда. На спартакіяду зьехалася 130 фізкультурнікаў з раёнаў. Спартакіяда працягнецца 3 дні.

Па ўсіх відах спорту адбыліся спаборніцтвы. Лепшым фізкультурнікам будуць выданы прэміі.

* * *

ПОЛАЦК, (наш кар.). 11 жніўня ў Полацку адкрылася акруговая сялянская спартакіяда. Прыбыўшыя фізкультурнікі адзначаюць, што спартыўны рух на вёсцы значна пашырыўся: расьце лік фізкультурных гурткоў. Спартакіяда адкрылася парадам усіх удзельнікаў спартакіяды і ўсіх членаў фізкультурных гурткоў гораду.

Фабрыка-кухня ў Менску

Гэтымі днямі ў Менск прыехаў інжынэр Нархарчу СССР, які азнаёміў ЦРК з праектамі пабудовы ў Менску фабрыкі-кухні.

Гэты праект абгаварваўся і зацьвярджаны Дзяржплянам БССР, які ўнёс цэлы рад нарэнтыў. Фабрыка-кухня, згодна праекту разьлічана, на водпуск 12 тысяч абедаў у дзень. 3 тысячы абедаў будзе выдавацца на месцы, 9 тысяч—развозіцца па фабрыках і заводах. Кошт будаўніцтва і абсталяваньня вызначаны ў 1 мільён 100 тысяч рублёў. 440 тысяч рублёў на гэта будаўніцтва і адпусьціў Нархарч СССР.

Будаўніцтва пачнецца вясной 1930 г. Для фабрыкі маркуецца адвесьці вучастак на рагу Інтэрнацыянальнай і Вандаўскай вуліц, дзе будзе пабудаваны 2-х паверховы будынак.

Па сваім абсталяваньні і пастаноўцы работы, фабрыка зьявіцца буйнейшай у СССР. Паводле такога-ж праекту будуецца фабрыка-кухня ў Растове-на-Дану.

Попыт на брусьніцу на замежных рынках

Упяршыню ў мінулым годзе Белдзяржгандаль узяўся за загатоўку і экспарт брусьніцы. Няўдалая тара, дрэнная рассартыроўка, няўмелы збор садзейнічалі таму, што, як загатоўчы, так і экспартны плян ня былі выкананы. Каапэрацыя, якая, наогул, неахвотна вяла загатоўку гэтага тавару,—здавала апошні ў зусім нерассартываным відзе, 1, натуральна, значная частка аказалася няпрыгоднай для экспарту.

Мы стаімо напярэдадні новай загатоўчай кампаніі брусьніцы. Раней усяго трэба адзначыць, што на замежных рынках ёсьць добрыя пэрспэктывы для рэалізацыі нашай брусьніцы, пры ўмове, канечна, калі яна будзе адпавядаць стандарту. У мінулым годзе ніводная загатоўчая арганізацыя ня прытрымлівалася правіл як зьбіраць, і кожны зьбіраў пасвойму.

Гэта дало страты як Белдзяржгандалю, так і каапэрацыі.

Трэба ціпер пры новай загатоўцы ўлічыць усе гэтыя ненармальнасьці і паставіць работу на правільную лінію.

Зборшчыкі, якімі пераважна зьяўляюцца сялянкі, канечна, ня могуць ведаць аб усіх дробязях і патрабаваньнях замежных рынкаў, і для гэтага нашым загатоўчым арганізацыям трэба ў першую чаргу шырока павесьці растлумачальную кампанію аб ролі і значэньні зьбіраньня брусьніцы з аднаго боку, а з другога—аб правільным зьбіраньні, каб праца работніц і сялянак ня была дарэмнай.

Адсутнасьць дакладных і правільных інструкцый—гэта вялікае зло, з якім трэба бязьлітасна змагацца, асабліва, пры загатоўцы прадуктаў, што хутка псуюцца.

Наогул у БССР толькі пачынае разгортвацца кампанія па загатоўцы плодаў-гародніцы. Да апошняга часу гэтым чамусьці не займаліся і на загатоўку гарадніны наогул мала зьвярталі ўвагі.

Каапэрацыя ў першую чаргу павінна праз сваю нізавую сетку разгарнуць вялікую работу і аказаць вялікую дапамогу экспарту, які ў хуткі час павінен заняць у экспартным пляне Беларусі важкае месца.

Л. АРСКІ.

Чыстка бірж працы ў Беларусі

З 15-га жніўня ў Беларусі пачынаецца генэральная праверка беспрацоўных бірж працы. Пасьля разумовай сэкцыі чыстку пройдуць юнсэкцыя, вытворчая, будаўнічая і сэкцыя чорнарабочых. ЦСПСБ зьвярнуў увагу прафарганізацый на неабходнасьць прыцягнуць усю рабочую грамадзкасьць да гэтай справы. У камісіі па чыстцы ўваходзяць прадстаўнікі прафэсіянальных арганізацый, РСІ, а таксама рабочыя з прадпрыемстваў.

* * *

15-га жніўня г.г. па Менскай біржы працы пачынаецца чыстка ўсіх беспрацоўных, якія лічацца на вучоце біржы працы.

Для дасягненьня большых вынікаў чысткі біржы працы ад чужога элемэнту, намісія просіць усіх рабочых, служачых і беспрацоўных г. Менску падаваць заявы ў камісію, якая знаходзіцца пры камітэце Менскай біржы працы.

НАРАДА АКТЫВУ МОПР'У

У пятніцу, 16 жніўня, а 7 гадз. увечары, у памяшк. вул. Імя К. МАРКСА

АДВУДЗЕНЦА

агульна-гарадзкая нарада актыву МОПР'у

Парадак дня: 1. Аб удзеле МОПР'у ў рэалізацыі 3-й пяцігодкі індустрыялізацыі. 2. Аб акруговай канфэрэнцыі МОПР'у.

На нараду павінны зьявіцца ўсе члены АК Райкомаў, Бюро ячэек і рэвізыйныя камісіі і жаночы актыў.

З прычыны важнасьці пытаньняў, просьба зьявіцца без спазьненьня.

Мен. АК МОПР'у.

Бібліяграфія

Чым кормяць нашых вучняў

Аб кнізе „Чырвоная Зьмена"

Кніжка «Чырвоная Зьмена»—гэта падручнік для другога году навучаньня. Мне невядома, у якім годзе напісалі яе аўтары—Калінкевіч і Мазур.

На **шостым** выданьні «Чырвонай Зьмены», якое вышла ў сьвет у 1929 годзе, зазначана: «Ухвалена навуковамэтадалёгічным камітэтам пры Наркамасьветы БССР».

Вачыма, ці чым іншым чытаў гэту кніжку навукова-мэтадалёгічны камітэт, калі даваў такі водгук—мне таксама невядома.

Зьвярнеце ўвагу на 116 старонку гэтага падручніка. Там вы ўбачыце загаловак: «Менш зямлі, вышэй дамы», а пад загалоўкам расказваецца, як вясковы хлапчук упяршыню папаў у горад. Ён дзівіцца на вялікія камяніцы і пытае свайго бацькі:

— Чаму гэта будынкі такія надзвычайна высокія?

Чуе такі адказ: «У горадзе мала зямлі, людзі імкнуцца на галоўныя вуліцы. Гарадзкія жыхары—гэта гандляры, служачыя, сярод іх ёсьць і рамесьнікі».

Вось аказваецца, хто гарадзкі жыхар. А мы кажам: змычка гораду з вёскай, пралетарскі горад павінен цягнуць за сабой вёску.

«Маленькага» ня прыкмецілі ў горадзе аўтары кніжкі, навукова-мэтадалёгічны камітэт і інш., праз чые рукі праходзіла «Чырвоная Зьмена»—яны ня прыкмецілі **толькі рабочае клясы.**

І такімі тэорыямі кормяць нашых дзяцей (кніжка выдавалася 6 разоў). Шмат з тых, для каго выдаецца «Чырвоная Зьмена», ніколі гораду ў вочы ня бачылі, уяўленьне аб гораду яны бяруць іменна з кніжкі, якая ім тлумачыць: «Гарадзкі жыхар служачы, або гандляр».

Нішто-сабе тэорыя.

Зараз у друкарні ўжо складзена ў старонкі 7-ае выданьне гэтага падручніку ў ліку 35.000 экзэмпляраў. Зноў гатова ва ўсе куткі паляцець «мудрае» тлумачэньне аб горадзе.

Можа, хто падумае, што ў кніжцы гэтай тлумачэньне аб горадзе—выпадковая памылка.

Не. Я не праглядала ўсю гэту кніжку, але бачыла, яшчэ некаторыя «цацкі», якія заслугоўваюць увагі.

Аўтары ў горадзе не заўважылі рабочае клясы, за тое яны падпільнавалі, што «Ленін, калі забілі Аляксандра Ульянава, праплакаў усю ноч і падушка яго нават была ўся мокрая ад сьлёз».

Гэта што? Спроба біць на дзіцячае пачуцьцё, каб дзеці пашкадавалі плачучага Леніна.

Такі шлях выхаваньня ў дзецях пашаны да праваднра сусьветнага пралетарыяту нам непатрэбны.

Далей. У кніжцы малюнак: там на лаўцы сядзіць Ленін, Крупская і два хлапчукі. Я заўсёды чытала, што гэта Ленін сярод дзяцей. «Чырвоная Зьмена» нам інакш тлумачыць: «Ленін з сям'ёй».

Цікава, з якога часу аўтары кніжкі далі Леніну 2-х сыноў у падарунак і хто іх прасіў аб гэтым.

Там-жа ў ленінскім аддзеле чамусьці ня раз скланяецца: «Сяляне і рабочыя, сялян і рабочых, сялянам і рабочым». Чаму гэта першае месца аўтары адвялі сялянам?

Як відаць, тут не адна памылка. Аб чым гаворыць рэшта старонак гэтага падручніка? Трэба, каб хтосьці зацікавіўся кніжкай пакуль ня выйшла 7-ае выданьне; каб зацікавіўся зараз, пакуль новыя 35.000 гэтай «мудрай» кніжкі не далятцелі да спажыўцоў-дзяцей рабочых і сялян.

В. ХМЯЛЕЎСКАЯ.

СУД

Антысэмітызм у пякарні арцелі „Чырвоны Інвалід" у гор. Полацку

Эрнэст Лесьнік—універсальны чалавек.

— Я ўсё ўмею рабіць,—хваліўся ён. Ні ад якой работы ніколі на адмаўляўся, і праз дзень другі лічыў сябе ўжо спэцам ва ўсякай рабоце.

Між іншым быў ён служачым у каапэратыве. Быў загадчыкам буфэту на ст. Дрэтунь. І вось тут «трошкі» растраціў грошай, за што і папаў у папраўчы дом на адзін год.

Па выхадзе з папраўчага дому, быў вартаўніком, потым дзесятнікам па лесараспрацоўках, а нарэшце зрабіўся... пекарам-абараначнікам у пякарні першай арцелі «Чырвоны Інвалід», у г. Полацку. Праз два-тры дні Лесьнік лічыўся ўжо «спэцам» і пачаў сябе «выяўляць».

Лесьнік прыходзіў на работу п'яным амаль што кожны дзень і, як «спэц», лічыў патрэбным да кожнага прыдрацца, кожнага павучыць.

Аднойчы ён пачаў вучыць ужо доўга працаваўшую у пякарні і вопытную абараначніцу-яўрэйку Зільбэрг і, калі яна ня слухала яго. Лесьнік кінуўся да яе біцца. Рабочыя не дапусьцілі. Лесьнік пакрыў Зільбэрг матам і пусьціў бруднымі галёшамі ў работніцу Хану Кузьняцову, якая заступілася за Зільбэрг.

Раз Лесьнік ня прышоў зусім на работу. Загадчык пякарні прапанаваў выканаць яго работу бараначніцам Зільбэрг і Чарткоўай. Праз шэсьць гадзін пасьля пачатку рабочага дня зьявіўся Лесьнік і, калі даведаўся, што за яго працуюць Зільбэрг і Чарткова, аблаяў загадчыка пякарні, уварваўся ў бараначную, падбег да стала, дзе ляжалі прыгатаваныя сырыя абаранкі, кінуў у астыўшае цеста і крыкнуў на работніц яўрэек: «жыдоўскія морды, я ўсё роўна ня буду больш працаваць з пагаными жыдоўкамі».

І сапраўды Лесьнік з «жыдоўкамі» ўжо больш не працаваў: яго вынялі з работы і аддалі пад суд.

Полацкі акруговы суд прыгавараў Лесьніка да пазбаўленьня волі са строгай ізаляцыяй на 1½ гады.

Вярхоўны суд прыгавар зацьвердзіў.

Паведамленьні

— Кастрычнікавы райком КП(б)Б па, ведамляе, што ў сераду, 14-га жніўня г. г. роўна, а 6-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні яўрэйскага клюбу Леніна, адбудзецца ўступны даклад т. Гольштэйна на тэму: Аб пяцігадовым плане народнае гаспадаркі і пастановах XVI-й партканфэрэнцыі і XII-га зьезду КП(б)Б.

Яўка сакратароў парт'ячэек, дырэктараў заводаў—партыйцаў, старшынь фабкомаў і мясцкомаў—партыйцаў, апоргаў ячэек, жанорганаў і арганізацыйнікоў абавязкова.

— 14 жніўня а 6 гадз. увечары пры РК адбудзецца нарада, на якую павінны ў абавязковым парадку зьявіцца:

а) сакратары ўсіх яч. КП(б)Б раёну,

б) старшыні мясцкомаў, заўкомаў, фабкомаў-партыйцы,

в) сакратары яч. Асоавіяхіму (якія зьяўляюцца членамі партыі).

Яўка ўсіх вышэйпаказаных т. т. абавязкова.

— Сёньня, а 7 гадз. увечары ў памяшканьні Фрунзаўскага райкому КП(б)Б адбудзецца чарговы дэлегацкі сход Фрунзаўскага раёну.

Яўка ўсіх дэлегатак абавязкова.

— Сёньня, 14 жніўня, а 7 гадзіне ўвечары адбудзецца нарада аргсэкцыі Кастрыч, нікавага райкому МОПР'у. Таварышам, якія належаць да гэтае сэкцыі, і таварышам, вылучаным з ячэек,—яўка ў абавязковым парадку.

— У чацьвер, 15 жніўня, а 6 гадзіне ўвечары адбудзецца пасяджэньне фракцыі, а 7 гадзіне пленум Кастрычнікавага райкому МОПР'у. Яўка ў абавязковым парадку. На пленум выклікаюцца наступныя члены жансэкцыі:

Гітэльман, Гіган, Партная, Чарная, Рэзьнік, Рахліс, Баброўнікава, Казей, Адарич Адзіванкіна, Тумаровіч, Вялічка і Лінскі.

— Сад Асьветы, Сёньня,—кіно «Мотэле Шпіндэр». Пач. у 9½ гадз.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

Водгукі на заметкі

НЯМА ПАДСТАЎ ДЛЯ ВЫКЛЮЧЭНЬНЯ З ПАРТЫІ

Менскае АКК паведамляе, што пасьля расьсьледваньня, справа партыйца работчага заводу «Домбаль» — **Самковіча** разглядалася Барысаўскай раённай партпройкай паводле заметкі «І ён пахаў», у якой пісалася аб **Самковічу**, які пры польскай акупацыі ўцёк за мяжу, потым зьвярнуўся ў СССР з грашыма, пабудаваў сабе хату, нядаўна адгуляў п'янае вясельле. Устаноўлена, што пералічаныя факты, як знаходжаньне Самковіча ва мяжой, зварот у СССР ня маюць ніякай варожай мэты з яго боку. **Цяпер Самковіч партыец і рабочы—вытрыманы, актыўны і няма падстаў для выключэньня яго з партыі.**

СПАЖЫЎЦЫ МАЛАКОМ ЗАБЯСЬПЕЧАНЫ

У допісе «Сыны і пасышкі» пісалася, што ў краме ЦРК на пасёлку «Каміптэрн» чамусьці заўсёды не хапае малака для ўсіх спажыўцоў, у той час, як у краме № 32, на Ляхаўцы, астаюцца лішкі. МЦРК паведамляе, што на пасёлак «Каміптэрн» штодзённа дастаўляецца 3-4 бітоны малака, у краму № 32 на Ляхаўцы, дастаўляецца 2-2½ бітоны і выдаецца па 1 з палов. літры. Становішча в забесьпячэньнем малаком спажыўцоў пасёлку «Каміптэрн» ня горшае.

СПРАВА НАКІРАВАНА НАРСЬЛЕДЧАМУ

Скончана сьледзтва па дасланай заметцы рэд. «Зьвязды», дзе пісалася аб злачынствах — **Кулікава**, загадчыка палявога млыну ў Казімірыўскім сельсавеце, Горацкага раёну. Факты пацьвердзіліся, справа накіравана нарсьледчаму з-та вучастку, Аршанскай акругі, **для прыцягненьня вінаватага да адказнасьці.**

КУЗЬНЯЦОВА НЕ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА БЯДНЯЧКАЙ

Па сутнасьці допісу, у якім адзначана было, што бяднячцы **Кузьняцовай**, сын якой служыць у Чырвонай арміі, Чырвона - Слабодзкі РВК адмовіў у дапамозе засесць зямлю, у той час, калі Кузьняцова галадала. Чырвона - Слабодзкі РВК дае тлумачэньне, што **Кузьняцова Геня не зьяўляецца бяднячкай.** У мінулым годзе яна плаціла с.-г. падатку 30 руб. 95 кап. Яе сын быў у Чырвонай арміі да восені 1928 году, зараз ён працуе на заводзе і дапамагае гаспадарцы. У веснавую сяўбу сельсавет ня змог аказаць дапамогі Кузьняцовай, бо **мелася больш бяднейшыя гаспадаркі.**

ВЫНІКІ РАСЬСЬЛЕДВАНЬНЯ ЗАМЕТКІ

У свой час рэд. «Зьвязды» дасла. на расьсьледваньне заметку аб нядбайнасьці і безгаспадарчасьці пры пабудове Ледневіцкай сямігодцы і аб грубых адносінах да вучняў **настаўніка Гарняка.** Аршанскае акруговае РСІ паведамляе наступнае: з боку Багушэўскага інспэктара нарасьветы была дапушчана нядбайнасьць пры складаньні дагавору на пабудову школы, у выніку чаго стварыўся перавыдатак на 2.000 р. Школа пабудавана дрэнна. Справа накірована акрпрокурору **для прыцягненьня рэвінспэктара да адказнасьці. Прыцягваецца таксама да адказнасьці падрадчык пабудовы школы — Раскін** за невыкананьне дагавору, акрамя таго, яму прад'яўляецца **грамадзянскі іск на суму па дадатковым рамонце школы.** Аб настаўніку **Гарняку** за яго грубыя адносіны да вучняў стаіць пытаньне **наконт яго далейшай працы ў школе.**

НІЯКАГА ЎДЗЕЛУ Ў П'ЯНЫХ ПРОВАДАХ НЯ ПРЫМАЎ

Мясцком Зембінскай больніцы дае даведку на допіс, надрукаваны ў газ. «Зьвязда» за № 163, пад загалоўкам «П'яныя провады», аб тым, што доктар Бэрштэйн В. С., аб якім таксама пісалася ў допісе, **ніякага ўдзелу ў п'яных провадах ня прымаў, а таксама ня зьмешчаны на ніжэйшую пасаду.**

КІНО-ТЭАТР „Культура"
НАВАЛЬНІЦА (БУРЯ) мастацкі фільм у 6 частках. Звыш праграмы КІНО-ХРОНІКА № 37. Каса адчынена ад 6 г. Пачатак а 8 гадз.

Кіно-сад ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Савецкая, 71.
Вялікі мастацкі баявік з эпохі панаваньня ПАУЛА 1-га Залатая Дзюба 2 сэансы: 1-ы с. а 9 г. 15 х., 2-гі а 10 г. 45 х.,

КІНО Інтэрнацыянал
Выключны мастацкі баявік ВАСІЛІНА Драма ў 6 частках. Звыш праграмы хроніка БЕЛДЗЯРЖКІНО № 18 Пачатак а 7 з пал. увеч. Каса ад 5 з пал. г

КІНО Пралетары
НЯМЕЦКІ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ вытворчасьці „Уфа-фільм" Горная баляда Драма ў 7 ч. з пролёгам Пачатак сэансу а 7 г. 15 хв. каса—ад 6 г.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр"
Новы фільм вытворчасьці „Совкіно" АДРАС ЛЕНІНА Драма ў 5 частках Пачатак 1-га сэансу а 3 г. 30 х., 2-гі—а 5 г. Па нядзелях кіно адчынена ад 12 гадз. дню.

КІНО СпартаК
Грандыёзны гістарычны баявік „ЛЕДЗЯНЫ ДОМ" у 7 частках У галоўнай ролі В. С. МАЛІНОЎСКАЯ Каса адчынена ад 6 г. Пачатак а 7 г. 30 м.

«У суботу, 17 жніўня г. г. у памяшканьні клюбу імя К. Маркса, а 7 гадзіне ўвечары адчыняецца

Менская агульна-гарадзкая рабочая кіно-канфэрэнцыя

з наступным парадкам дню:

1. Даклад Белдзяржкіно аб становішчы кіно-работы у Беларусі. (Дакладчык т. ГАЛКІН).
2. Аб кіно-абслугоўваньні масавага рабочага глядача. (Дакладчык т. КЛІМОВІЧ).
3. Выбары Мастацка-Палітычнага Савету кіно-«Культура».

Мандаты выдаюцца ў чацьвер—15 і ў пятніцу—16 жніўня г. г. Ў агульнай канцэлярыі ЦСНСБ з 2-х да 7-мі гадзін увечары і ў суботу да 3-х гадз. дню, а з 5-ці да 7-мі гадзін увечары — у клюбу імя К. Маркса.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР Музыкальная камэдыя і нам. опэра пад маст. кіраўн. Л. Г. МІРАЕВА.
Серада, 14 жніўня „Мистер Икс" Прэм'ера у 3-х д. Кальмана.
Білеты ў касе тэатру ад 12—2 і ад 5 г. ув. і ў раб. 4—6 гадз. увеч. каса з 12—2 і ад Пачатак а 9 г.

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты адбываецца да 2-ое гадзіны дня

Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва
АБВЯШЧАЕ
ТЭМЫ НА НАВУКОВА-ПАПУЛЯРНЫЯ МАСАВЫЯ КНІЖКІ
1. СЭРЫЯ „ЖЫВАЯ і НЯЖЫВАЯ ПРЫРОДА".
а) „Якімі карыснымі выкапнямі багата БССР".
б) „Флёра і фаўна беларускіх балот".
в) „Фаўна водных басэйнаў БССР".
г) „Ворагі і прыяцелі чалавека з нябачнага сьвету".
д) „Як расьліны змагаюцца за сваё жыцьцё".
е) „Грыбы-чужаеды, іх шкода для с.-гаспадаркі і змаганьне з імі".
ж) „Жывёлы—прыяцелі сельскае гаспадаркі".
з) „Жывёлы—шкоднікі сельскае гаспадаркі".
і) „Флёра і фаўна мора".
к) „Пахаджэньне жыцьця на зямлі".
УМОВЫ: 1. Ганарар 80 рублёў за аркуш (40.000 друк. знакаў). 2. Апошні тэрмін здачы рукапісу не пазьней 1 лістапада г. г. 3. Памер кніжкі на болей 3 аркушоў. 4. Зьмест павінен быць разьлічаны на масавага чытача. 5. Да рукапісу дадаць ілюстрацыі або сьпіс з паказаньнем, адкуль можна ўзяць кожную ілюстрацыю (аўтар, назва кнігі, год выданьня і № старонкі).
Заявы на атрыманьне заказу ад БДВ прысылаць разам з кароткім зьместам будучага рукапісу.
Заявы прымаюцца асабіста, па тэлефону і пісьмова (з іншых гарадоў).
Апошні тэрмін падачы заяў 20 жніўня г. г.
Адрас для заяў і даведак: Менск, Савецкая 63, Белдзяржвыдавецтва, тэлефон 5